МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН. ТУТ
СОВ. СТРОИТ. И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦКіМККП(б)Б, ЦВКіСНК БССР

№ 126 (5800) | 3 чэрвеня 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Яшчэ вышэй узнімем рэволюцыйную пільнасць!

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ПАРТЫЙНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ—Выступленні ў спрэчках па дакладу гаркома КП(б)Б т.т. Васільевай, Гураліса, Анціпенка, Шнееравай, Лісковіча, Кавалёва.

У прэзідыуме ЦВК Саюза ССР.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА: І. П. Райгардзецкі — Арганізаваць вытворчасць дахавых матэрыялаў; Е. Цэлікаў — Мае прапановы.

ЗА РУБЯЖОМ:

Выступленне тав. М. М. Літвінава па сесіі бюро канферэнцыі па раззбраенню;

Адозва комуністычнай і соцыялістычнай партый Іспаніі;

Акт адкрытай інтэрвенцыі;

Канцэнтрацыя германскага флота ля іспанскіх берагоў;

Дыпламатычныя шагі Англіі;

Урадавы крызіс у Японіі.

ЯШЧЭ ВЫШЭЙ УЗНІМЕМ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ!

Совецкая дзяржава мацнее з кожным днём. Як ніколі, яна магутна. Расце аўтарытэт партыі і ўрада ў масах. З прыняццем Сталінскай Канстытуцыі яшчэ больш пашырылася масавая база пролетарскай дыктатуры, павялічылася армія актыўных будаўнікоў соцыялістычнага грамадства і барацьбітоў за абаронную магутнасць соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Мацнее эканамічная база дыктатуры пролетарыята — соцыялістычная гаспадарка. Рад галін прамысловасці выканалі пяцігадовы план за 4 гады. Рабочыя і сяляне, натхнёныя і ўзброеныя найвялікшым дакументам эпохі — Сталінскай Канстытуцыяй, падымаюць сцяг соцыялістычнага спаборніцтва за паспяховае выкананне плана XX года з дня Вялікай соцыялістычнай Кастрычніцкай рэволюцыі, плана апошняга года другой пяцігодкі.

Тым больш злобнічае вораг. Яго нянавісці няма мэры. Каварны і вераломны вораг пераўзышоў і ўдасканаліў усе метады бандытаў з вялікай дарогі. Гэта — сапраўдныя сучасныя людаеды. Нічога святога не існуе для іх. Жыцці лепшых рабочых, іх жонак і дзяцей знішчаюць яны, каб паслабіць магутнасць вялікай радзімы прапоўных усяго свету — Совецкага Саюза, каб засмуціць радасць вялікага народу, які гераічна змагаецца за ажыццяўленне лепшых ідэалаў чалавецтва, — за комунізм.

Вораг актыўна рыхтуецца да вайны. Шпіянаж, якім капіталістычныя дзяржавы карысталіся, як сродкам падрыхтоўкі да вайны, з прыходам фашыстаў да ўлады дасягнуў страшэнных размераў. Шпіён — верны пелаахоўнік капітала і абаронец буржуазных правапарадкаў, у самай агідцелай яго форме. Шкодніцтвы і дыверсіі — дадатак шпіянажу, сродак аслаблення абаронай магутнасці краіны. Усю гэту страшэнную сістэму, чалавеканенавісніцкую па сваёй сутнасці, вораг кінуў у СССР, каб паслабіць магутнасць краіны і такім чынам зрабіць яе менш боездольнай у той вайне, якую фашызм рыхтуе супроць СССР.

БССР у ваенных планах германскага фашызма супроць Совецкага Саюза займае віднае месца. БССР — прадмет прагненняў фашысцкіх дзяржаў. Сюды контрразведкі Германіі і Польшчы накіроўваюць свае бандыцкія атрады.

Падасланыя ў нашу краіну, шпіёны і дыверсанты — майстры падпалаў і забойстваў з-за вугла — вярбуюць сабе кадры, у асаблівасці з людзей, якія знаходзіліся раней у буржуазных, дробнабуржуазных і контррэволюцыйных арганізацыях. Яны ўсякім спосабам прабуюць ажывіць дзейнасць разгромленых варожых народу партый і груп. Яны стараюцца ўпягнуць у сваю сець усіх, хто калі-небудзь зрабіў злачынства супроць совецкай улады. Яны прабуюць разгарнуць на тэрыторыі БССР базу для сваёй падрыўной работы супроць Совецкага Саюза.

З усёй яснасцю ўяўляюць сабе гэты каварны план ворага дэлегаты менскай гарадской партыйнай канферэнцыі. Вось чаму ў спрэчках яны жорстка крытыкуюць гарком за забыццё ў сваёй практычнай рабоце капіталістычнага акружэння СССР і пагранічнага становішча Менска — сталіцы БССР. Вось чаму пытанні павышэння пільнасці і ўзброенасці комуністаў у барацьбе з ворагамі займаюць пэнтральнае месца ў спрэчках. Дабрадушнасці, бясклопатнасці, даверлівасці, падхалімству комуністы абвясцілі рашучую вайну. Не зважаючы на асобы, дэлегаты ўскрываюць распяп і носьбітаў дабрадушнасці. Пад агонь самакрытыкі ўзялі яны тую практыку гаспадарчай, совецкай і партыйнай работы, якая давала магчымасць ворагу доўгі час арудаваць у нашым асяроддзі і маскіравацца.

Верны вартавы завяванняў Вялікай соцыялістычнай Кастрычніцкай рэволюцыі, органы НКУС выкрылі, зламалі на месцы злачынства групу ворагаў, якая, замаскіраваўшыся, дзейнічала на тэрыторыі БССР на працягу раду год. Бандыты аказаліся настолькі крывадушнымі і майстэрскімі двурушнікамі, а комуністы, працаваўшыя побач з імі, настолькі даверлівымі і бясклопатнымі, што вораг пранік нават на кіруючыя адказныя пасты. Выкрыты, як ворагі народу, Бенек і Дзякаў, якія на працягу раду год шкодзілі ў нашай рэспубліцы.

«Праграма» гэтых бандытаў, якія працавалі па заданню замежнай контрразведкі, была ясная і простая. Яны ставілі сваёй задачай адарваць БССР ад Совецкага Саюза, аслабіць рэспубліку і такім чынам палегчыць вайну фашызма супроць Совецкага Саюза. Гэтыя гнусныя, подлыя бандыты хацелі зноў надзець беларускаму народу ярмо памешчыкаў і капіталістаў, зноў вярнуць яго пад пяжар раз'юшанай эксплаатацыі і грабяжоў каланізатараў.

Адна група ворагаў злоўлена, выкрыта і абяшкоджана. Было-б, аднак, недаравальнай памылкай думаць, што выкрыты і выкарчаваны ўжо ўсе ворагі з нашых радоў. Наадварот, выкрыццё ворагаў толькі пачалося. Святы абавязак і закон жыцця комуністаў і ўсіх працоўных БССР — не толькі раскрыць і разграміць ворага без астатку, але і стварыць такую сістэму работы, якая выключала-б магчымасць пранікнення ворагаў у наша асяроддзе.

Вораг хітры, ён глыбока канспіруецца. Толькі частка яго кадраў вядзе адкрытую дыверсійную работу. Астатнія зараз сябе амаль нічым не праяўляюць, чакаючы моманту вайны, калі яны поўнасцю і без астатку разгорнуць свае сілы. Вось чаму адсутнасць на тым ці іншым прадпрыемстве, у той ці іншай галіне гаспадаркі шкодніцкіх і дыверсійных актаў яшчэ ні ў якім разе не азначае, што там няма прытаіўшайся фашысцкай змяі.

«Значыць, не ўбаюкваць трэба партыю, а развіваць у ёй пільнасць, не ўсыпляць яе, — а трымаць у стане баявой гатоўнасці, не раззбройваць, а ўзбройваць, не дэмабілізоўваць, — а трымаць яе ў стане мабілізацыі...» (І. Сталін).

Каб лягчэй ускрыць ворага, неабходна знішчыць тыя ўмовы, якія даюць магчымасць хавацца і маскіравацца ворагу. Трэба абвясціць самую рашучую і бяліталасную барацьбу так званым «звычайным» недахопам, прарывам, паломкам. Трэба абвясціць рашучую барацьбу злачыннай неахайнасці і расхлябанасці ў рабоце. Абвясціць рашучую барацьбу супроць канцыляршчыны і бюракратызма, бо ўсё гэта з'яўляецца ўмоваю, якая палягчае маскіравацца ворагу.

Рашучая вайна павінна быць абвешчана цярпімасці да парушэнняў рэволюцыйнай законнасці. Ні адзін факт парушэння рэволюцыйнай законнасці, дзе-б ён ні адбыўся — на прадпрыемстве, у калгасе, у соўгасе, МТС,—не можа быць пакінут без уважлівага і ўдумлівага разбору прычын, паралізіўшых яго, без самай уважлівай праверкі парушальнікаў рэволюцыйнай законнасці.

Рашуча трэба перабудаваць кіраўніцтва наркаматамі з боку Соўнаркома БССР. Апарат Соўнаркома кітайскай сцяной агароджваўся ад мас. Галадзед, які сам баяўся самакрытыкі, культываваў у апараце бюракратычныя адносіны да сігналаў мас, прывіваючы работнікам прывычкі саноўных устаноў старога часу. Дэлегаты канферэнцыі справядліва крытыкавалі антыпартыйную праваапартуністычную практыку работы Галадзеда, патрабуючы аператыўнасці ад Соўнаркома, узмацнення яго сувязі з масамі, чулых адносін да сігналаў і крытыкі мас і рашучага змянення сістэмы кіраўніцтва наркаматамі. Пара Соўнаркому адказваць за работу наркаматаў, пара наркаматам стаць штабамі тэхнічнага кіраўніцтва, звязанымі з масамі!

Большэвіцкая самакрытыка — праверяная зброя партыі і працоўных мас у барацьбе з недахопамі, прарывамі і ворагамі народу. Вось чаму дэлегаты патрабавалі, каб крытыка і самакрытыка недахопаў работы была пакладзена ў аснову работы ўсіх гаспадарчых, совецкіх і партыйных арганізацый.

Як ніколі, нам трэба павысіць зараз увесь узровень работы, усямерна павышаючы рэволюцыйную пільнасць. Гэта — асноўнае патрабаванне Пленума ЦК ВКП(б) да партыйных арганізацый. У гэтым—сэнс і галоўны змест лозунга, высунутага партыяй і вялікім Сталіным, аб авалоданні большэвізмам.

Ніколі не павінны мы забываць, што «рэволюцыйная пільнасць з'яўляецца той самай якасцю, якая асабліва неабходна зараз большэвікам» (І. Сталін).

ХІІІ З'ЕЗД КП(б)У

КІЕЎ, 1 чэрвеня. (БЕЛТА). На ранішнім пасяджэнні ХІІІ з'езда КП(б)У з заключным словам выступіў тав. С. В. Касіор.

Затым з'езд заслухаў і зацвердзіў даклад мандатнай камісіі. На з'езде прысутнічаюць 685 дэлегатаў з рашаючым і дарадчым голасам, абраных ад 331.726 членаў і кандыдатаў КП(б)У. Сярод дэлегатаў з рашаючым голасам 58,8 проц. упершыню абраныя на з'езд.

Па дакладу тав. С. В. Касіора аб рабоце ЦК КП(б)У з'езд аднагалосна прыняў наступнае рашэнне:

«ХІІІ з'езд КП(б)У, абмеркаваўшы справаздачу ЦК КП(б)У прызнае палітычную лінію ЦК КП(б)У правільнай.

З'езд у той-жа час адзначае, што пры значных дасягненнях ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва ЦК КП(б)У запусціў у практычнай рабоце рад сур'ёзных памылак».

Для складання рэзалюцыі па дакладу тав. Касіора абрана камісія ў складзе 31 чалавека.

АДКРЫЛАСЯ МАЗЫРСКАЯ АКРУГОВАЯ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫЯ

2 чэрвеня, у 6 гадзін вечара, адкрылася мазырская 2-я акруговая партканферэнцыя. На канферэнцыю з'явілася 267 дэлегатаў з правам рашаючага голасу, з ліку 330 выбраных. З правам дарадчага голасу з'явілася 47 дэлегатаў, з ліку выбраных 54.

Пад бурныя апладысменты канферэнцыя выбрала ганаровы прэзідыум у складзе Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным, і тт. Ежова, Дзімітрава, Тэльмана і Хозе Дыяса.

З дакладам аб рабоце акругкома партыі выступіў першы сакратар акругкома т. Ананнеў.

ФРАЛОЎ.

АДВАЖНЫЯ ЗАВАЯВАЛЬНІКІ ПАЎНОЧНАГА ПОЛЮСА



Герой Совецкага Саюза, камандзір самалёта «СССР Н-170» М. В. Вадап'янаў.

Герой Совецкага Саюза, камандзір самалёта «СССР Н-171» тав. В. С. Молакаў.

Тав. А. Д. Алексееў, камандзір самалёта «СССР Н-172»

Камандзір самалёта «Н-169» тав. І. П. Мазурук.

У ПРЭЗІДЫУМЕ ЦВК САЮЗА ССР

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ ДЭКАДЫ УЗБЕКСКАГА МАСТАЦТВА

На працягу дэкады калектыў Узбекскага Дзяржаўнага музыкальнага тэатра і Дзяржаўнай філармоніі дэманстравалі перад прадоўнымі сталіцы Саюза мастацтва узбекскага народу.

За вялікія поспехі ў развіцці узбекскага мастацтва ўрад СССР пастанавіў узнагарадзіць калектывы Узбекскага Дзяржаўнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Хамза (выступаўшага ў Масквэ ў мінулым годзе), музыкальнага тэатра, філармоніі, а таксама асобных майстроў мастацтва.

2 чэрвеня на пасяджэнні Прэзідыума ЦВК СССР М. І. Калінін уручаў узнагароды.

Ад імя калектыва Драматычнага тэатра, узнагароджанага ордэнам Леніна, заслужаная артыстка Узбекскай ССР Сара Ішантураева заяўляе:

— Атрымліваючы высокую ўзнагароду, мы выражаем глыбокую падзяку партыі і ўраду і абяцаем, што апраўдаем яе з гонарам.

З хвалюючай прамовай выступае на узбекскай мове народная артыстка СССР Насырава Халіма. Яна дзякуе партыі і ўраду ад імя калектыва Узбекскага музыкальнага тэатра, атрымаўшага ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Народны артыст Узбекскай ССР Кары Якубаў, прымаючы ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга Узбекскай філармоніі, гаворыць, што ўзнагарода натхніць калектыў Маладой філармоніі на стварэнне сапраўднай совецкай музыкі, песні і танца.

Пад апладысменты да стала прэзідыума падыходзяць узнагароджаныя ордэнамі майстры узбекскага мастацтва.

Драматург Нугманаў Каміл горача дзякуе ўраду ад імя работнікаў мастацтва Узбекістана.

— Гэта прызнанне поспехаў, — гаворыць ён, — напаўняе нас гордасцю і натхняе на авалоданне яшчэ большымі вышынямі культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу. Пад жыватворчымі праменнямі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі з казачнай хуткасцю расцвяло і заззяла ўсімі сваімі дзівоснымі гранямі мастацтва ўзбекскага народу. Вялікая дапамога вялікага рускага народу, мацярынскія клопаты і любоў кіраўнікоў партыі і ўрада на чале з правадыром народаў таварышам Сталіным, да узбекскага народу натхняюць нас на новыя дасягненні, — заяўляе ён пад бурныя апладысменты прысутных.

Перад закрыццём пасяджэння М. І. Калінін звярачаецца да ўзнагароджаных з прамоваю. (БЕЛТА).

НА СХОДЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ

Са спрэчак усё больш выразна вырысоўваецца парочная сістэма ў кіраўніцтве саюза пісьменнікаў. Падхалімства і ўгодніцтва ў адносінах Александровіча, знайдзіна, склокі ў кіраўніцтве і паміж асобнымі пісьменнікамі, заціск крытыкі і самакрытыкі спрыялі таму, што дзеянні ворага не атрымлівалі своечасовага адпору, што нельга было адразу разгледзець двурушнікаў і замаскіраваных ворагаў. Пра гэта яскрава гаварылі выступаўшыя тт. Шарапаў, Паслядовіч, крытык т. Парт.

— Нацыяналізм і завуаляваныя контрреволюцыйныя выпалы ў ранейшай творчасці Александровіча, — гаворыць т. Кучар, — і нізкая якасць у яго творчасці апошніх часоў былі не выпадковы. Александровіч не парваў з ганебным мінулым, двурушнічаў, покуль гэтага не выкрылі другія.

Многія факты, аб якіх гаварыў т. Кучар на сходзе, былі вядомы яму даўно. Але з-за беспрынцыпнасці, характэрнай для Кучара, яны захоўваліся «для больш зручнага моманту».

Кузьма Чорны і З. Бядуля расказалі сходу пра свой удзел у літаратурных аб'яднаннях «Маладняк» і «Узвышша». Па сутнасці гэта былі, як і «Полымя», арганізацыі, створаныя ворагамі народа, з іх яны чэрпалі кадры для варожай дзейнасці. Правільна асвятліўшы характар аб'яднанняў, з якімі былі звязаны тт. Чорны і Бядуля, яны, аднак, зусім недастаткова раскрытыкавалі свае ўласныя нацыяналістычныя памылкі, якія былі ўласцівы ім на пэўных этапах творчасці.

З палітычна завостранай прамовай выступіў тав. Галавач. Канкрэтна на прыкладах ён гаварыў аб прычынах, якія давалі магчымасць арудаваць у беларускай літаратуры трацкісцка-авербахаўскім прыспешнікам Дунцу, Бэндэ і нацдэмаўскім паследышам.

Мінулае аблічча Александровіча акрэслена ў яго творчасці і супрацоўніцтве з ворагамі народа, але гэта замоўчвалася і сам Александровіч усяляк захоўваў ад грамадскасці. У сваім выступленні тав. Галавач намеціў шляхі, па якіх павінна ісці далейшае выкрыццё трацкісцка-авербахаўскай дзейнасці ў Беларусі.

Учора таксама выступілі тт. Ларчанка, П. Броўка, Вольскі, Краснеўскі, Левін, Мальцінскі, Ільінскі і М. Лынькоў.

Спрэчкі, якія разгортваліся ўчора на сходзе, не ўзняты на прынцыповы ўзровень. У спрэчках заўважаецца тэндэнцыя больш гаварыць аб мінулых фактах і менш закранаць сучаснае становішча работы саюза пісьменнікаў. Агонь спрэчак, галоўным чынам, быў накіраваны на выкрытага ворага народа Дунца і на алышоўшага ад літаратуры Бэндэ, як на праваднікоў авербахаўшчыны, і на справах Александровіча. І Дунец, і Бэндэ, і падобныя ім мелі сваіх прыспешнікаў у асяроддзі працуючых пісьменнікаў, крытыкаў і драматургаў, між тым у спрэчках не прагучэлі іх імёны і дзейнасць.

Зусім абыйдзены творчыя пытанні, ні слова не гаворыцца пра літаратурныя плыні, што нараджаліся, як вынік уплываў ворага на літаратуру. Не атрымоўвае дастатковага асвятлення і багема, існаваўшая і не выкараненая поўнасцю сярод пісьменнікаў. Багема была адным са сродкаў, якім дзейнічаў вораг на літаратурным фронце.

Сёння сход працягвае работу.

Ал. ЛЕБЕДЗЕЎ.
Т. ХАДКЕВІЧ.

Канцэрт ордэнаноснага Якава Зака

Учора ў Менску ў клубе імя Сталіна адбыўся канцэрт саліста лаўрэата міжнароднага конкурса піяністаў імя Шапена ў Варшаве ордэнаноснага Якава Зака. Слухачы выключна цёпла сустрэлі пераможцу міжнароднага конкурса.

Якаў Зак з вялікім майстэрствам выканаў другі канцэрт Шапена у суправаджэнні сімфанічнага аркестра Дзяржаўнай філармоніі БССР. Выдатная ігра лаўрэата захапіла слухачоў.

Дзяржаўная філармонія БССР зрабіла вельмі каштоўны пачын, арганізаваўшы канцэрт Я. Зака. Трэба спадзявацца, што ў хуткім часе мы ўбачым у сталіцы БССР і пераможцаў міжнароднага конкурса скрыпачоў.

Разам з тым, філармонія дапусціла памылку, што ў праграме яна дала магчымасць паслухаць Зака толькі ў адной вялікай рэчы, але-ж публіка чакала і вельмі жадала паслухаць Зака ў вялікім самастойным канцэрце. Справа ў тым, што большую частку праграмы заняў канцэрт аркестра Дзяржаўнай філармоніі. Аркестр пад кіраўніцтвам дырыжора праф. Маскоўскай кансерваторыі Лео Гінзбурга выканаў 4-ю сімфонію Чайкоўскага і увертуру з оперы «Рыенцы» Вагнера.

Сёння ў клубе імя Сталіна адбудзецца другі канцэрт ордэнаноснага Якава Зака.

Н. Г.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. М. М. ЛІТВІНАВА НА СЕСІІ БЮРО КАНФЕРЭНЦЫІ ПА РАЗЗБРАЕННЮ

ЖЭНЕВА (горад у Швейцарыі, месцапрабыванне Лігі нацый), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Пасля лорда Крэнборна на бюро канферэнцыі па раззбраенню з кароткай заявай выступіў учора тав. Літвінаў.

Тав. Літвінаў напомніў, што абмяркоўваемае пытанне было ўзнята яшчэ ў трэцяй камісіі асамблеі (Лігі нацый) у верасні 1936 г., калі тав. Літвінаў вызначыў пазіцыю совецкага ўрада. Гэта пазіцыя заключаецца ў тым, што, прыдаючы па-ранейшаму найбольшае значэнне прадстаўленай ім схеме поўнага ўсеагульнага раззбраення, совецкі ўрад гатоў падтрымаць і менш радыкальныя прапановы, якія ідуць у тым-жа напрамку. У адпавядзнасці з гэтай пазіцыяй совецкі ўрад, па ініцыятыве брытанскага ўрада, уступіў у перагаворы з апошнім аб морскім пагадненні, якое ў сучасны момант ужо гатова для падпісання.

Далей тав. Літвінаў заявіў: «У верасні 1936 года я выказаў сумненне ў магчымасці ажыццявіць ў сучаснай міжнароднай абстаноўцы якія-б там ні было, хоць-бы самыя ўмераныя, планы па скарачэнню ўзбраенняў. Падзеі, мэўшыя месца пасля верасня, не толькі не рассеялі, але, наадварот, узмацнілі гэтыя сумненні. Трэба шкадаваць аб тым, што прыходзіцца займацца праблемамі заўтрашняга дня замест таго, каб сканцэнтраваць усю ўвагу на актуальных праблемах сёнешняга дня. Сёнешні-ж дзень дыктуе не абмежаванне будучых узбраенняў, а хутчэй абмежаванне актыўнасці існуючых узбраенняў.

Сёнешні дзень патрабуе, каб некаторыя ўрады зразумелі, што ўзбраенні павінны быць скарыстаны толькі для абароны ўласнай краіны, што ваенныя атрады не павінны пасылацца ў іншыя краіны, што ваенная авіяцыя не павінна асыпаць бомбамі іншыя краіны, што ваенны флот не для таго існуе, каб бамбардыраваць гавані і адкрытыя гарады чужых дзяржаў. Вось праблемы, якія неабходна вырашыць у першую чаргу. Гэта, вядома, не значыць, што мы адмаўляемся абмяркоўваць міжнародныя задачы і заўтрашняга і паслязаўтрашняга дня, і таму я заяўляю, што не маю ніякіх пярэчанняў супроць абмеркавання і прыняцця прапаноў, зробленых прадстаўніком французскага ўрада Поль Бонкурам».

АДОЗВА КОМУНІСТЫЧНАЙ І СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАРТЫЙ ІСПАНІІ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Соцыялістычная партыя, комуністычная партыя і Ўсеагульны рабочы саюз Іспаніі звярнуліся да Камінтэрна, да Другога і Амстэрдамскага інтэрнацыяналаў, а таксама да сваіх нацыянальных секцый з адозваю па повалу бамбардыроўкі Альмерыі германскай эскадрай. Зварот заклікае да ўмацавання салідарнасці з іспанскім народам і да таго, каб дабіцца энергічнага ўздзеяння на ўрады фашысцкіх дзяржаў.

У звароце гаворыцца: «Авангард сусветнага пролетарыята павінен прыняць усе меры для мабілізацыі пролетарскай салідарнасці з народамі, якія не хочуць, каб ажыццявіліся планы фашызма і каб свет ператварыўся ў пекла ўсеагульнай бойні».

Адозва падпісана ад імя соцыялістычнай партыі Ламонеда, ад імя комуністычнай партыі Дыясам і намеснікам генеральнага сакратара Ўсеагульнага рабочага саюза Рэтэлем.

***

ВАЛЕНСІЯ, 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Сакратар анарха-сіндыкалісцкай нацыянальнай канфедэрацыі працы Васкес наведаў сёння галаву іспанскага ўрада Негрына і паведаміў яго, што нацыянальная канфедэрацыя працы перад тварам грознай небяспекі лічыць сваім абавязкам прапанаваць ураду маральнае і матэрыяльнае падтрыманне.

ЗАЯВА НЕГРЫНА

ВАЛЕНСІЯ, 2 чэрвеня. (БЕЛТА). 31 мая ўпершыню мадрыдская газета «Эль соль» вышла ў якасці афіцыяльнага органа комуністычнай партыі Іспаніі. У перадавым артыкуле газета падкрэслівае поспех прадстаўніка рэспубліканскай Іспаніі ў Лізе нацый Альварэса дэль Вайо.

У нумары змешчана гутарка галавы іспанскага ўрада Негрына з прадстаўніком газеты «Эль соль». Негрын заявіў карэспандэнту, што вельмі рад гутарыць з прадстаўніком органа комуністычнай партыі, органа той вялікай народнай партыі, якая з'яўляецца прыкладам самаадданасці і дысцыпліны ва ўсім, што датычыць вайны і адзінства народу.

Негрын заявіў, што рэспубліканская армія поўнасцю ўжо асвоіла сучасную тэхніку і дысцыпліну. У Іспаніі, сказаў Негрын, заўсёды армія была слабым месцам. Пасля вайны, заявіў Негрын, новая, магутная іспанская народная армія стане фактарам усеагульнага міру.

Выразіўшы захапленне гераізмам насельніцтва Мадрыда, цяпер стаўшага сапраўды духоўнай сталіцай Іспаніі, Негрын сказаў, што з першай хвіліны мяцежу іспанскі народ карысталіся пагрыманнем вялікага совецкага народу. Совецкі народ, заявіў прэм'ер, робіць усё магчымае, каб аблягчыць пакуты іспанскага народу. Совецкі Саюз прыняў іспанскіх дзяцей, як уласных. Совецкі Саюз заўсёды аказваў маральнае падтрыманне Іспаніі, ён заўсёды стаяў побач з Іспаніяй у пытаннях міжнароднай палітыкі.

ДЭМАНСТРАЦЫІ СУПРОЦЬ ІНТЭРВЕНТАЎ У МАЛАЗЕ І САЛАМАНЦЫ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Орган радыкал-соцыялістаў «Эвр» паведамляе, што ўчора ў Саламанцы і Малазе (гарадах, занятых мяцежнікамі) адбыліся дэманстрацыі супроць інтэрвентаў.

На вуліцах Малагі натоўпы іспанцаў пратэставалі супроць інтэрвенцыі. Мелі месца крывавыя сутычкі паміж італьянцамі і немцамі, з аднаго боку, і іспанцамі — з другога. Зроблена шмат арыштаў. Парадак, згодна паведамлення газеты, адноўлен італьянскім атрадам.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас з Мадрыда, у ноч на 1 чэрвеня мяцежнікі, абложаныя ва Універсітэцкім гаралку, імкнуліся прадпрыняць нечаканую атаку. Атака была адбіта са значнымі стратамі для мяцежнікаў. У 5 гадзін 1 чэрвеня мяцежнікі вымушаны былі адыйсці на выходныя пазіцыі.

Зносіны паміж Ла Граніха (на паўночны захад ад Мадрыда) і Сеговіяй перарваны. Дарога, якая злучае абодва пункты, знаходзіцца пад агнём рэспубліканцаў. Самалёты рэспубліканцаў бамбардыравалі раніцою 1 чэрвеня Сіера дэ Граніха, Бальсаін і Сеговію. У Сеговіі бамбардыроўкай значна пашкоджаны Алькасар (крэпасць) і артылерыйская акадэмія.

Пасля поўдня 1 чэрвеня мяцежнікі, засеўшыя ў будынку палаца ў Ла Граніха, атрымалі значныя падмацаванні і прадпрынялі ярасную атаку на пазіцыі рэспубліканцаў.

Генерал Міяха заявіў журналістам, што на паўночным захадзе ад Мадрыда, прадаўжаюцца жорсткія баі. Рэспубліканцы занялі першую лінію акопаў, пабудаваных мяцежнікамі ў лесе Бальсаін.

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ПАРТЫЙНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

2 чэрвеня

Ранішняе і вячэрняе пасяджэнні

Як і ў першы дзень, у цэнтры ўвагі партыйнай канферэнцыі — пытанні большэвіцкай пільнасці. Дэлегаты, якія выступаюць у спрэчках, прыводзяць дзесяткі фактаў недапушчальнага ратазейства, бесклапотнасці ў Менскай партарганізацыі.

У часе праверкі і абмену партыйных дакументаў у Менскай арганізацыі было ўскрыта нямала ворагаў народу — агентаў япона-нямецкіх контрразведак — трацкістаў, правых рэстаўратараў капіталізма, контррэволюцыйных нацыяналістаў, жулікаў і прайдзісветаў. З гэтага партарганізацыя не зрабіла адпаведнага палітычнага вываду. Яна не мабілізавала ўвагу кожнага комуніста, непартыйных большэвікоў на яшчэ большае ўзняцце рэволюцыйнай пільнасці. Наадварот, дзе-ні-дзе ў пярвічных арганізацыях і нават у самім гаркоме і горрайкомах палічылі, што цяпер вораг, быццам, выкрыт. Гэта прыводзіла да добрадушнасці, самасупакоенасці. А вораг тымчасам глыбей заканспіраваўся і праводзіў сваю шкодніцкую работу.

На трыбуне т. Карнілаў (энергакамбінат). Ён расказвае, што шкоднікі нямала папрацавалі над тым, каб сарваць развіццё энергетычнай гаспадаркі Менска. На электрастанцыі мелі месца факты яўнага шкодніцтва, няправільная ўстаноўка матораў і інш., кіраўнікі-ж станцыі расцэньвалі гэта, як простыя «тэхнічныя непаладкі».

— Зусім нядаўна, — гаворыць работніца завода імя Кірава тав. Барсукова, — выяўлена, што варожая рука падрэзала болт падёмніка, што магло прывесці да чалавечых афяр. Ёсць выпадкі, калі выпушчаны з цэха добраякасны варштат пападае да спажыўца нягодным.

Гарком не быў цесна звязаны з масамі працоўных. Да голасу радавых комуністаў і беспартыйных рабочых і служачых гарком не прыслухоўваўся. Вострыя палітычныя пытанні не ставіліся на абмеркаванне партыйных мас.

— На рабочых сходах, — гаворыць тав. Кляўко (завод імя Молатава), — прадстаўнікі гаркома не прысутнічалі, яны не выступалі на іх. З рабочымі не гаварылі і не выпадкова, што рабочыя не ведаюць работнікаў гаркома і райкомаў і, наадварот, апошнія не ведаюць рабочых. Цяпер, калі мы пайшлі да выбараў прафсаюзных арганізацый на аснове тайнага галасавання, мы востра будзем адчуваць слабую сувязь з рабочымі масамі.

Выступаўшы ў спрэчках дывізійны камісар т. Юнг падрабязна спыніўся на рабоце ваенных партарганізацый. Ён патрабаваў яшчэ большага ўзмацнення дзелавой сувязі між ваеннымі і грамадзянскімі партарганізацыямі. Тав. Юнг рэзка крытыкуе работу гаркома. Вострыя пытанні, — гаворыць ён, — гарком баяўся выносіць на абмеркаванне партарганізацыі. У прыватнасці, пытанне аб непартыйных учынках Галадзеда старанна ўтойваліся ад масы комуністаў. Нават, калі месцамі гэта вырывалася стыхійна, то і тады стараліся «ўладзіць» пытанне. Малейшая спроба крытыкі апарата СНК разглядалася, як «парушэнне ўстояў». У гаркоме не было рэзкай пастаноўкі пытання, усё вырашалася ціха, па-сямейственаму.

На канферэнцыі выступіў Андрэй Александровіч. Дэлегаты чакалі, што ён здолее як большэвік ускрыць свае памылкі, іх карэнні, даць ім належную палітычную ацэнку, да канца раздзелацца са сваім нацыяналістычным хвастом. Александровіч не апраўдаў надзеі дэлегатаў. Замест выкрыцця сваіх памылак ён зрабіў толькі просты пералік іх, прытым далёка няшчыры. Яго прамова не была палітычна завостранай і не дарма дэлегаты вымушаны былі рэплікамі падпраўляць яго. Александровіч прадставіў справу так, што ён быццам з-за сваёй непісьменнасці (?!) аказаўся ў палоне нацыяналістычных элементаў, што ўсе яго памылкі з'яўляюцца выпадковымі і што пачынаючы з 1930 года ён быццам-бы стаў на правільны шлях.

Дэлегаты асталіся яўна незадаволенымі выступленнем Александровіча. Выступіўшы ўслед за ім тав. Юркоў (рэдактар «Звязды») рэзка раскрытыкаваў яго прамову.

— Александровіч не быў шчырым, — гаворыць тав. Юркоў. — Ён не раскрытыкаваў сваіх памылак. Партканферэнцыя дала яму магчымасць выступіць і зрабіць гэта. Ён не зрабіў гэтага. Александровіч няправільна прадстаўляе справу так, што быццам паміж ім, — Александровічам 1930 года і пасля 1930 года ляжыць непраходная грань. Гэта няверна. Яму трэба было расказаць канферэнцыі, што і ў 1931 годзе з-пад яго пяра выйшлі вершы з трацкісцкімі і нацыяналістычнымі ўстаноўкамі, што і ў 1933 і ў 1936 г. ён перавыдаў зборнік сваіх вершаў, куды ўключыў контррэволюцыйныя вершы. Калі прызнаваць памылкі, то гэта трэба рабіць па-большэвіцку, без хістанняў, каб раз і назаўсёды пакончыць з імі.

Рэзкай крытыцы падвяргаецца на канферэнцыі работа Соўнаркома БССР. Тт. Юркоў, Варончанка, Конеў, Геаргадзе і іншыя ўказваюць на антыпартыйную лінію работы Соўнаркома.

— Ворагі скарыстоўвалі групаўшчыну, якая была ў КП(б)Б, — гаворыць тав. Варончанка, — у гэтым віноўны і гарком, і ЦК КП(б)Б. Галадзед праводзіў антыпартыйную работу. Ён быў арганізатарам гэтай групаўшчыны. Усе незадаволеныя і пакрыўджаныя элементы групаваліся вакол яго. У ЦК стараліся не псаваць адносіны з ім. Галадзед баяўся крытыкі, ён яе заціскаў і выхоўваў у гэтым духу і свой апарат. Калі на сходзе актыва Менскай гарадской партарганізацыі была падвергнута крытыцы работа СНК, Галадзед ацаніў гэта, як паход супроць яго. Усе памятаюць, як комуністы завода «Большэвік» выкрылі ворага народу — трацкіста Галенца. Калі гаком выключыў яго з партыі, Галадзед і ў гэтым разгледзеў паход супроць СНК. Так было і з выключэннем з партыі ворага Пятровіча, якога ён характарызаваў, як чэснага, адданага комуніста.

Многія з выступаючых указвалі, што Соўнарком тармазіў развіццё гаспадаркі сталіцы БССР—Менска.

Са змястоўнай прамовай выступіў нарком унутраных спраў тав. Берман. Ён спыніўся на двух пытаннях: аб балбатлівасці і наўменні некаторых комуністаў хаваць дзяржаўную і партыйную тайну і пытаннях павышэння рэволюцыйнай пільнасці. «Разгром ворага, які доўгі час арудваў на тэрыторыі БССР, сказаў ён, толькі пачаўся; і каб з поспехам і найхутчай завяршыць яго, неабходна актывізацыя комуністаў і дапамога партыйных арганізацый органам НКУС».

Вялікае месца ў рабоце канферэнцыі займае пытанне работы профсаюзных арганізацый. Гарком і ЦК КП(б)Б не ажыццяўлялі штодзеннага кіраўніцтва профсаюзамі.

Выступіўшы ў спрэчках загадчык аддзелам кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б тав. Рубінштэйн указвае на рад буйнейшых прарываў у рабоце Менскага гаркома. Ён гаворыць, што гарком не пачаў яшчэ пасур'ёзнаму перабудоўваць сваю работу ў адпаведнасці з патрабаваннямі лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б). Гарком не аказвае канкрэтнай дапамогі пярвічным партарганізацыям, не вучыць іх працаваць пановаму. Такое важнейшае пытанне, як правільная, на аснове ўліку здольнасцей, жаданняў і ўзроўню комуністаў, дача партдаручэнняў членам партыі не пастаўлена на належную вышыню.

Гарком не ўняў перад арганізацыяй ні аднаго буйнага праблематычнага пытання партыйнай работы. Гэта-ж ганьба, гаворыць ён, што ў Менскай арганізацыі налічваецца ўсяго 800 спачуваючых і што з пачатку прыёму ў партыю прынята ўсяго 5 чалавек. Гэта характарызуе дрэнную, нягодную работу гаркома.

Далей тав. Рубінштэйн спыняецца на рабоце СНК БССР. Радам прыкладаў і дакументаў ён даводзіць, што Галадзед праводзіў антыпартыйную, праваапартыністычную практыку.

Рад дэлегатаў указвае на слабасць пастаноўкі антырэлігійнай прапаганды. Гэты важнейшы ўчастак работы з'яўляецца самым закінутым у партарганізацыі. Гарком не займаўся падрыхтоўкаю кадраў для антырэлігійнай прапаганды.

Крытыцы падвяргаецца работа цэнтральных газет і Аддзела друку ЦК КП(б)Б. Яны не перабудавалі сваю работу, не ўзнімаюць пытанні, хвалюючыя комуністаў.

— Газеты «Звязда» і «Рабочий», — заявіла тав. Дзяткова,—не вучаць партарганізацыю як палепшыць работу. Шаблонна, суха яны падаюць матэрыял.

У канцы вячэрняга пасяджэння з вялікай прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч. Ён указаў, што Менская партарганізацыя правяла выбары пярвічных і раённых партарганізацый на высокім палітычным узроўні.

— Мы да Пленума не мелі такога становішча, каб радавыя комуністы рэзка крытыкавалі работу гаркома, ЦК КП(б)Б, нават газеты і тыя не крытыкавалі Менскую партарганізацыю. Цяпер крытыка разгарнулася. Але было-б памылковым заявіць, што мы яе разгарнулі да канца, што яна стала метадам нашай штодзеннай работы.

У радзе звенняў Менскай арганізацыі была прытуплена большэвіцкая пільнасць, інакш мы ўскрылі-б ворагаў значна раней. Гэта, вядома, не азначае, што Менская арганізацыя нічога не рабіла ў гэтым напрамку. У часе праверкі і абмену партдакументаў было выкрыта нямала трацкісцкіх, правых, нацыяналістычных і іншых контррэволюцыйных элементаў. Але яны не былі выкрыты да канца.

У тым, што ў арганізацыі асталіся ворагі, вінаваты і гарком і ЦК КП(б)Б. Мы забылі, што ворагі будуць падсылаць нам сваіх агентаў для шкодніцкай, шпіёнскай работы. Мы забылі аб тым, што поспехі, якія бясспрэчна ёсць у БССР, маюць і ценявы бок, што яны могуць прывесці да зазнайства, самавыхвалення і страты пільнасці. Падхалімства, угодніцтва, важдзізм, што мела месца ў КП(б)Б і Менскай арганізацыі, перашкаджалі выкрыць ворагаў.

Тав. Шаранговіч падрабязна спыняецца на задачах Менскай арганізацыі ў справе ажыццяўлення рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б). Ён указвае на тое, што да гэтага часу не ліквідавана недапацэнка партыйна-палітычнай работы, партыйнай прапаганды. Нічога не змянілася ў пастаноўцы палітычнай агітацыі, у рабоце з актывам. Важнейшыя задачы стаяць цяпер перад партарганізацыяй у справе правядзення справаздачна-выбарчых сходаў і перабудовы работы комсамольскіх і профсаюзных арганізацый.

Тав. Шаранговіч указвае на слабасць работы наркаматаў, на іх непаваротлівасць у справе ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

— Мы патрабуем рэзкага палепшання работы, пакончыць з дабрадушнасцю, разяваццвам. Той, хто думае, што ў Соўнаркоме адбылася простая змена людзей, памыляецца. Справа куды глыбей. Справа ў тым, што Соўнарком, на чале з Галадзедам, праводзіў не нашу большэвіцкую лінію, а антыпартыйную, праваапартыністычную.

У заключэнне тав. Шаранговіч выказаў упэўненасць у тым, што Менская арганізацыя, узброеная рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б), яшчэ вышэй узніме рэволюцыйную пільнасць і згуртуе пясней свае рады вакол сталінскага ЦК ВКП(б) і вялікага Сталіна.

***

Усяго за 2 дні ў спрэчках выказалася 54 чал. Учора канферэнцыя рашыла спыніць спрэчкі па справаздачнаму дакладу гаркома.

Спрэчкі па дакладу аб рабоце гаркома КП(б)Б

У зале пасяджэнняў IV менскай гарадской партканферэнцыі.
НА ЗДЫМКУ: дэлегаты партканферэнцыі слухаюць спрэчкі па справаздачнаму дакладу гаркома партыі.
Фото Я. Салавейчыка.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ВАСІЛЬЕВАЙ

(САКРАТАР ПАРТКОМА НАРКОМАСВЕТЫ)

Нельга сказаць, што гарком не займаўся комуністамі, працуючымі ў органах Наркомасветы. Але як займаўся? Аднойчы гарком сабраў комуністаў, працуючых у школах. Да чаго звёўся гэты сход? Ён прывёў да таго, каб рэабілітаваць Кузняцову.

Комуністы папракалі Кузняцову ў грубасці, адсутнасці канкрэтнага кіраўніцтва. Вастрыня крытыкі была змазана на сходзе.

Далей тав. Васільева спыняецца на пытанні, што спрыяла беспакаранай рабоце ворагаў народу на радзе ўчасткаў нашага будаўніцтва.

— Шуміха, самахвальства, зазнайства, якое мела месца ў нашых арганізацыях, прывяло да таго, што мы не прыкмячалі работу ворагаў, своечасова іх не выкрывалі.

Спыніўшыся падрабязна на фактах падрыўной, шкодніцкай работы ворагаў народу на чале з мацерым ворагам, шпіёнам Дзякавым у органах і ў апараце Наркомасветы, тав. Васільева гаворыць аб задачах, якія павінны быць ажыццёўлены партыйнымі арганізацыямі ў справе ліквідацыі шкодніцтва.

Асаблівую ўвагу яна аддае пытанню павышэння ўзроўню партыйна-масавай работы сярод настаўніцтва.

У заключэнне тав. Васільева спыняецца на становішчы антырэлігійнай прапаганды ў Менскай арганізацыі. Яна папракае гарком, што гэтай рабоце не ўдзялялася неабходнай увагі.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ГУРАЛІСА

(САКРАТАР ПАРТКОМА БДУ)

Самым слабым звяном у рабоце гаркома КП(б)Б з'яўляецца кіраўніцтва партыйна-палітычнай работай у навучальных установах. Гарком партыі ў адносінах да партарганізацый вышэйшых навучальных устаноў быў у ролі спачуваючага. Работнікі гаркома спачувалі, але нічога практычнага не рабілі для таго, каб дапамагчы партарганізацыям ВНУ. Кіраўніцтва раду ВНУ на працягу некалькіх год узначальвалася ворагамі народу.

Гэтыя ворагі народу — трацкісты, нацдэмы Дзякаў, Кучынскі — ўсяляк імкнуліся нашкодзіць у рабоце навучальных устаноў. Яны ўсяляк працавалі над тым, каб падарваць гэта дзеючча ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

На справаздачна-выбарчых сходах ўскрыты буйнейшыя прарывы ў рабоце партарганізацыі ВНУ. Мы тое-сёе пачынаем рабіць у справе перабудовы партыйнай работы. Але гэта пакуль з'яўляецца тым недастатковым мінімумам нашых мерапрыемстваў.

У заключэнне тав. Гураліс спыняецца на тым, якую практычную дапамогу чакаюць партыйныя арганізацыі ад гаркома і райкомаў, у прыватнасці, па пытаннях паскарэння рашэння аб хутчэйшай прысылцы рэктара і арганізацыі партгабінета.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. АНЦІПЕНКА

(ЦК САЮЗА СЯРЭДНІХ ШКОЛ)

Прапаганда і палітычная агітацыя як сярод комуністаў, так і беспартыйных у Менску знаходзіцца на нізкім узроўні. Сакратары гаркома непасрэдна партпрапагандай не кіравалі, яны перадаверылі гэта культпропу, а культпропа на працягу доўгага часу таксама не было. У выніку ніхто гэтай важнейшай работай не кіраваў. З прыходам Задзернюка становішча таксама не змянілася ў лепшы бок.

Спыняючыся на пытаннях работы сярод настаўніцтва, т. Анціпенка гаворыць, што ў Менску налічваецца да 2.000 настаўнікаў. Пытанню іх палітычнага выхавання не аддаецца ніякай увагі.

Палітгурткі ў большасці сваёй прапавалі без плана і без кіраўніцтва. З культпропа гаркома на занятках ніхто ні разу не быў. А што датычыць райкомаў партыі, то яны наогул лічаць, што справа палітасветы настаўніцтва гэта — не іх справа. Калі я паставіла пытанне перад культпропам Варашылаўскага райкома тав. Алер аб тым, каб дапамагчы нам, яна мне адказала: «Няма ў мяне прапагандыстаў». Калі я сказала, што буду звяртацца ў культпроп гаркома, яна па-абывацельску кідае мне рэпліку: «Ну ідзі здымі мяне з работы». Аб усім гэтым я напісала тав. Рыскіну. Дакладная запіска ў Рыскіна праляжала два тыдні, пасля ён даручыў гэту справу інструктару Лукіной, якая месяц «вазілася» з гэтым пытаннем, а прапагандыстаў для сеткі палітшкол сярод настаўніцтва мы і да гэтага часу не атрымалі.

Гарана таксама ад работы па палітычнай асвеце настаўніцтва ўхіліўся. Там не разумеюць таго, што палітычна непісьменны настаўнік не можа быць добрым выхавальнікам дзяцей.

У заключэнне тав. Анціпенка гаворыць, што такое становішча выкарыстоўваюць варожыя элементы для сваёй падрыўной работы. Мы абавязаны павышаць большэвіцкую пільнасць, непрымірымасць да ворагаў. А гэтага можна дасягнуць толькі павышэннем узроўню прапагандысцкай і палітычна-масавай работы.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. БАРСУКОВАЙ

(ЗАВОД ІМЯ КІРАВА)

Нас аддзяляе вельмі малы прамежак часу ад таго моманту, калі мы хвалілі адзін аднаго, калі гаварылі толькі аб дасягненнях і ні ў якім выпадку не аб недахопах. У нас на заводзе імя Кірава былі свае правадыры. Мы пад гром апладысментаў сустракалі іх прамовы. Правадыры гэтыя былі з трыкутніка завода.

Справаздачна-выбарчы партыйны сход паклаў канец гэтым агідпасцям. Апладысментаў ужо не чуць, але заціск крытыкі і самакрытыкі ёсць. Я прыведу такі факт. У нас на справаздачным сходзе чалавек 10 у сваіх выступленнях абвінавачвалі аднаго комуніста, начальніка цэха ў падхалімстве, сямейственасці і грубых адносінах да рабочых. Больш таго, пастуціў матэрыял у газету «Кіравец» аб тым, што ён атрымаў 1.000 рублёў на ўборку цэха. Рабочыя ўбралі, а ён забраў сабе 241 руб. Парторг узяўся за гэту справу, а дырэктар выступае і гаворыць:

— Навошта вы яго чапаеце? Ён з кожным днём пачынае трапіць аўтарытэт, гэта абураюча, калі начальнік цэха не карыстаецца аўтарытэтам. Партком стварыў камісію па неўмяшанню. І на гэтым справа скончылася. Ясны заціск крытыкі.

Хачу сказаць аб абароннай рабоце. З гэтай справай у нас не ўсё добра. У нас на заводзе ёсць ваенны работнік. Ён вечна кудысьці спяшаецца, заўсёды яму няма часу і ўсё спасылаецца на нейкія ваенныя тайны, а працы няма. Атрымлівае-ж ён 600 рублёў у месяц. Я сустаю ў санітарнай камандзе, але работы там няма. Толькі калі гэты работнік уехаў на курорт, пачалася некаторая работа.

У нас на заводзе ёсць факты шкодніцтва, дрэнная якасць прадукцыі. Калі-б мы перабудаваліся ў рабоце, палюбілі-б крытыку, то рабочыя дапамаглі-б нам выяўляць недахопы, выкрываць шкоднікаў, якіх мы яшчэ не выкрылі.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ШНЕЕРАВАЙ

(ДЗІЦЯЧАЯ КЛІНІКА)

Я хачу сказаць адносна малалікіх арганізацый і аб тым, як гарком і горрайком кіруюць імі. Я працую ў дзіцячай клініцы. Партарганізацыя наша малалікая — ўсяго 4 чалавекі. Але на нашай партарганізацыі ляжыць задача вельмі адказная. Разам з тым ні гарком, ні горрайком не дапамагалі нам паставіць на належную вышыню партыйна-палітычную работу.

Вось адзін характэрны факт. У 1935—36 навучальным годзе нашы комуністы займаліся ў Доме партактыва. У 1936 годзе пераарганізавалі вучобу ў Доме партактыва, і нашы члены партыі зусім перасталі займацца. Я стала звяртацца да культпропа Сталінскага горрайкома тав. Азірскага. Ён так і не займаўся гэтым пытаннем, адкладваючы з тыдня на тыдзень. Нарэшце, калі я рэзка паставіла пытанне перад Дзятковай, Азірскі заявіў: «Кінь, калі ласка, шчабятаць». Толькі ў рэзультаце настойлівых патрабаванняў арганізавалі гурток пры Доме партактыва.

Некалькі слоў аб Доме партактыва. Дом партактыва працуе выключна дрэнна. У ім холадна, няўтульна. Загадчыка Дома партактыва тав. Лазарава вечарам не знойдзеш.

У заключэнне тав. Шнеерава гаворыць аб тым, што гарком партыі зусім недастатковую ўвагу аддае пытанням аховы здароўя. Разам з тым гэтыя пытанні набываюць для Менска выключнае значэнне.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ЛІСКОВІЧА

(САКРАТАР СТАЛІНСКАГА ГОРРАЙКОМА КП(б)Б)

Справядліва будзе запытаць у нас, як новаабраныя райкомы партыі прыступілі да ажыццяўлення ўказанняў Пленума ЦК ВКП(б) аб перабудове партыйнай работы. Прыступаем мы да гэтай работы вельмі марудна, непаваротліва. Але сёе-тое паспелі зрабіць.

Сталінскі райком партыі ўлічыў рэзкую крытыку, якая была на раённай канферэнцыі адносна слабай сувязі з пярвічнымі арганізацыямі. Мы ўжо паспелі звязацца, хоць не з усімі, але асноўнымі партарганізацыямі. Работнікі райкома зрабілі ўжо рад дакладаў і інфармацый па бягучых палітычных пытаннях. Відаць, у мінулым мы вельмі мала займаліся палітычнай інфармацыяй. Праведзеная намі работа паказвае, што партарганізацыі праяўляюць выключную зацікаўленасць, выключную задаволенасць гэтай інфармацыяй. І такую палітінфармацыю патрэбна праводзіць у больш шырокім маштабе.

Мы прымацавалі асноўны кіруючы партыйны актыў раёна да пярвічных арганізацый для практычнай дапамогі ў ажыццяўленні ўказанняў Пленума ЦК ВКП(б). Але я хачу сказаць, што нашы члены райкома, выбраныя два тыдні таму назад, нездавальняюча выконваюць рашэнне партыі аб сувязі з масамі. Што перашкаджае нам у гэтай рабоце? Мне думаецца, і гэта правільна, што нас моцна заядае цякучка.

Мы правялі ўжо некаторую работу па зацвярджэнню намеснікаў сакратароў парткомаў. Да гэтага пытання партыйныя арганізацыі падыходзяць сур'ёзна. Калі мы добра папрацуем з вылучанымі людзьмі, то будзем мець не дрэнны рэзерв партыйных работнікаў. Хачу прывесці для прыкладу пару найбольш характэрных кандыдатур, зацверджаных намеснікамі сакратароў парткома. Вось тав. Кірэнер з завода «Большэвік», стары кадравы рабочы, член партыі з 1923 года, актыўны большэвік. Калі з гэтым чалавекам папрацаваць — будзем мець не дрэннага сакратара парткома.

Тав. Асаёнак—завод імя Кірава. Вельмі сур'ёзны таварыш, добра працуе. Таз. Горагляд — фабрыка імя Крупскай, тав. Чэрчыс — завод імя Варашылава і інш., з якіх мы ў будучым будзем мець добрых партыйных работнікаў.

Адна заўвага па адмоўнаму моманту, з якім мне прышлося сутыкнуцца ў рабоце Сталінскага горрайкома. Гэта арганізацыя прыёму ў партыю. У радзе партыйных арганізацый мы маем недаацэнку гэтага пытання. Між тым, у нас ёсць узрослыя выдатныя кадры як са складу старых рабочых добрых непартыйных большэвікоў, так і сярод моладзі, комсамольцаў. І, калі-б з імі сур'ёзна папрацавалі, мы мелі-б рост партыйных арганізацый. Партыйныя арганізацыі з гэтымі людзьмі не працуюць. Вось, напрыклад, партарганізацыя завода імя Варашылава за ўвесь час з моманту апублікавання пісьма ЦК ВКП(б) аб аднаўленні прыёму ў партыю не прыняла ні аднаго чалавека. Не лепш і ў другіх арганізацыях.

Я хачу спыніцца на рашэнні ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб вызваленні тав. Галадзеда ад паста старшыні Соўнаркома.

Пасля апублікавання гэтага рашэння мне прыходзілася гаварыць з радам таварышоў, і думаю, што правільна выкажу настрой усёй нашай партыйнай арганізацыі, калі скажу, што гэта рашэнне з'яўляецца своечасовым і правільным, адлюстроўваючым сапраўдныя большэвіцкія настроі нашай арганізацыі.

Мне, як работніку сяла, прыходзілася вельмі часта сутыкацца з дзейнасцю Соўнаркома, які ўзначальваў т. Галадзед. У нас, у сельскіх работнікаў, быў такі настрой, што калі хочаш угробіць жывую справу, то звярніся ў Соўнарком. Гэта месца, дзе любая прынцыпова-палітычная справа спускалася на тармазы. Рашэнне партыі аб вылучэнні тав. Валковіча на пост старшыні Соўнаркома з'яўляецца таксама адлюстраваннем думкі і настрояў партарганізацыі.

Мы, партыйныя работнікі, павінны аказаць тав. Валковічу максімальную дапамогу ў разгортванні сапраўднай большэвіцкай работы і ліквідацыі астаткаў шкодніцтва.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. КАВАЛЕВА

(САКРАТАР ВАРАШЫЛАЎСКАГА ГОРРАЙКОМА)

Наша канферэнцыя праходзіць пасля гістарычных указанняў Пленума ЦК ВКП(б) аб палепшанні партыйнай работы. Тут, на канферэнцыі, трэба прызнаць, што гарком, таксама як і райкомы, якіх моцна крытыкавалі на справаздачных сходах і на раённых канферэнцыях, зусім мала зрабіў для ажыццяўлення рашэнняў Пленума.

На справаздачных сходах і канферэнцыях былі ўскрыты найглыбейшыя прарывы ў пастаноўцы партыйнай прапаганды. Дрэнны падбор і кіраўніцтва прапагандыстамі. Ні гарком, ні райкомы не зрабілі нічога, апрача склікання нарад прапагандыстаў, і толькі прыступілі да праверкі прапагандыстаў. Тут выступаў Готфрыд, але і ён не сказаў, што зрабіў аддзел партыйнай прапаганды ў гэтым пытанні.

Райкомы партыі адчувалі кіраўніцтва ЦК і гаркома ў часе абмену партыйных дакументаў, але як толькі арганізацыя была прынята, ЦК і гарком зусім мала дапамагалі райкомам.

І ў выніку—мы маем рад палітычных памылак, калі, захапіўшыся некаторымі поспехамі, прагледзелі прамых ворагаў народу, якія, прыкрываючыся партыйнымі білетамі, займалі адказныя пасты і шкодзілі нам,—гэта Бенек, Дзякаў, а ў профсаюзных арганізацыях—Корф, Серпень і іншыя.

Усё гэта гаворыць аб нашай палітычнай слепаце і аб тым, што мы не зрабілі апавешных вывадаў з рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і даклада таварыша Сталіна.

У нас вельмі многа размоў аб перабудове, аб правядзенні ў жыццё ўказанняў таварыша Сталіна ў яго пісьме да складальнікаў гісторыі партыі. А час не перніць. Комуністы павінны зараз-жа пачаць вывучаць гісторыю партыі на падставе ўказанняў таварыша Сталіна. Тав. Готфрыд не сказаў, што канкрэтна робіцца ў гэтай галіне.

Аб нашых кадрах. Пасля выбараў і справаздач у нас значна змяніўся склад парткамітэтаў, парторгаў. Па Варашылаўскаму раёну ёсць упершыню выбраных 44 проц. членаў парткомаў. Гэта гаворыць аб тым, што новыя партыйныя работнікі асабліва адчуваюць патрэбу ў нашай дапамозе. Ці ўсё мы робім для гэтага? Вядома, не.

Больш таго, пытанне аб інструктарах, як у раёнах, так і ў гаркоме, не вырашана. У нас-жа ў райкоме няма інструктароў. Няўжо мы ў Менскай партарганізацыі не можам падабраць інструктароў! Гэта гаворыць аб тым, што мы не здолелі вылучыць новыя растучыя кадры, якіх у Менскай партарганізацыі дастаткова.

Як абстаіць справа з намеснікамі сакратароў парткомаў? Мы не выканалі рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б). Мы ў райкоме зацвердзілі ўсяго 12 намеснікаў. Мы маем у некаторых парткомах і несур'ёзны падыход да гэтага важнейшага пытання. З вылучанымі таварышамі яшчэ ніякай работы не праводзіцца.

Усе ЦК саюзаў знаходзяцца ў Варашылаўскім раёне. Адносіны да профсаюзбюро ЦК КП(б)Б зусім мала займаліся профсаюзамі, і мы там маем вялікую засмечанасць. Старшынямі саюзаў часта назначаліся выпадковыя людзі. ЦК і гарком партыі павінны дапамагчы райкому ў кіраўніцтве профсаюзамі.

НА МОЗЫРШЧЫНЕ НЕ ГАТОВЫ ДА СЕНАЎБОРКІ

Калі вясной гэтага года ў многіх калгасах Мозырскай акругі нехапіла грубых кармоў для жывёлы, акруговыя партыйныя і совецкія кіраўнікі, б'ючы сябе ў грудзі, не раз паўтаралі:

— Нам, Палессю, якое так багата заліўнымі лугамі, проста соромна не мець удосталь свайго сена.

Сапраўды соромна. У акрузе налічваецца больш 200 тыс. гектараў розных сенажацяў. План сенакашэння ў мінулым годзе складаў толькі 188 тыс. гектараў. Фактычна-ж было скошана і ўбрана не больш 150 тыс. Астатняя сенажаць асталася няскошанай. У радзе калгасаў акругі асталося зімаваць няскошанага лугу па 200—300 гектараў, а ў некаторых, як напрыклад, «Камінтэрн», Жыткавіцкага раёна — 1000 гектараў. Больш таго, значная частка калгаснага сена была расцягнута ўжо са стагоў.

Здавалася-б, што акруговы камітэт партыі і акрвыканком павінны былі ўлічыць мінулагоднія памылкі і зрабіць для сябе неабходныя вывады. Аднак гэтага не здарылася, аб чым вельмі яскрава сведчыць яўна нездавальняючае становішча падрыхтоўкі калгасаў да сенаўборкі.

Асобныя сельгасарцелі акругі пачалі ўжо касіць балотную сенажаць, а акрземаддзел усё яшчэ збіраецца даць раёнам дырэктыву аб падрыхтоўцы да сенакашэння. Таму няма нічога дзіўнага, што акрземаддзел не ведае сапраўднага становішча спраў у калгасах па частцы падрыхтоўкі іх да сенаўборкі. Ён нават не ведае, колькі ў калгасах акругі ёсць сенаўборачных машын і ці спраўны яны.

Важнейшай задачай у галіне падрыхтоўкі да сенаўборкі з'яўляецца ачыстка лугоў ад хмызняка і галля, а таксама ахова іх ад страўлення жывёлай. Між тым на гэта зусім мала звярачаецца ўвагі. Так, у калгасе «Першамайск», Лельчыцкага раёна, хмызняком зарасло 40 гектараў сенажаці і 20 гектараў завалена розным галлём. У калгасе «Большэвік», Петрыкаўскага раёна, галлём завалена 30 гектараў лугу, а праўленне і не думае аб тым, каб арганізаваць калгаснікаў на ачыстку гэтых лугоў.

У радзе калгасаў Мозырскага раёна дзесяткі гектараў, прыгоднага для сенакашэння лугу, страўліваюцца жывёлай. Так, у сельгасарцелі «Чырвоны маяк», Якімавіцкага сельсавета, на добрым лугу з самага пачатку вясны пасуцца каровы калгаснікаў.

Падобныя факты ў акрузе не адзінкавы. Аднак яны ніколькі не турбуюць акруговых і раённых кіраўнікоў.

ФРАЛОЎ.

ЛЕПШЫ ПАПАР—ПАД НАСЕННЫЯ ЎЧАСТКІ

Насенныя ўчасткі павінны даваць не толькі высокаякаснае насенне для пасеву, але і высокі ўраджай у калгасах і соўгасах.

Лепшым папярэднікам для насенных участкаў азімых культур з'яўляецца чысты папар. На добра апрацаваных папарах ёсць поўная гарантыя, што гатунковае насенне не будзе засмечана падаліцай або іншым пустазеллем. Выдаляенне папараў для насенных пасеваў забяспечвае высокі ўраджай зернавых.

Ворыва папараў неабходна праводзіць у раннія тэрміны. Чым раней падняты папары, тым больш інтэнсіўна ідзе барацьба з пустазеллем і больш накапляецца пажыўных матэрый і вільгаці ў глебе. Пры засмечанні папаравага ўчастка корнеатрыскавым (асот, малачай) і карнявішчным (пырэй і інш.) пустазеллем або аўсюгом першае ворыва робіцца на глыбіню 20—25 см. Калі магутнасць ворнага пласта не дапускае такога ворыва, то ўзорваюць на поўную глыбіню гэтага пласта.

Для рацыянальнай барацьбы з пустазеллем і паляпшэння якасці раздзелкі глебы ўзорваюць плугамі з прадплужнікам. Калі няма плугоў з прадплужнікам, пры дастатковай пягавай сіле, на землях, засмечаных пырнікам, участак арэцца спачатку на глыбіню залягання карнявішчаў — 10—12 см. Пасля ўзорвання карнявішча неадкладна вычосваюць прунжынным культыватарам, баронамі і драпачамі. Следам за вычосваннем карнявішчаў, папары ўзорваюцца на поўную глыбіню.

Адначасова з ворывам ідзе баранаванне ў 2—3 сляды. Спозненае баранаванне папараў моцна прасушвае паднятыя папары. На папары пад азімыя культуры ўносіцца гной. Раскідванне гною па полю рабіць у дзень яго заворвання, каб недапусціць улятучвання азоцістых матэрый.

Папары пры дапамозе апраповак патрэбна ўвесь час падтрымліваць у чыстым ад пустазелля становішчы. Для апрацоўкі папару скарыстоўваюцца спецыяльныя культыватары, многалямешнікі, драпачы, букеры і т. д. Пры недахваце гэтых прылад ужываюць і лёгкія плугі. Пасля кожнай культывацыі поле тут-жа павінна быць забаранавана. Пры ўшчыльненні верхняга пласта глебы, пры ўтварэнні на паверхні коркі, папары культывуюць, або толькі баруюць, нават у тым выпадку, калі яны астаюцца чыстымі ад пустазелля.

Задача кожнага калгаса і соўгаса даць пад насенныя ўчасткі культурны папар.

Аграном І. ОГНЕЎ.

КЛАСАВЫЯ ВОРАГІ АРУДУЮЦЬ У КАЛГАСЕ „ПРАГРЭС"

Калгас «Прагрэс», Горкаўскага сельсавета, стаў рассадніцкія атрады.

Падасланыя ў нашу краіну, шпіёны і дыверсанты — майстры падпалаў і забойстваў з-за вугла — вярбуюць сабе кадры, у асаблівасці з людзей, якія знаходзіліся раней у буржуазных, дробнабуржуазных і контррэволюцыйных арганізацыях. Яны ўсякім спосабам прабуюць ажывіць дзейнасць разгромленых варожых народу партый і груп. Яны стараюцца ўцягнуць у сваю сець усіх, хто калі-небудзь зрабіў злачынства супроць совецкай улады. Яны прабуюць разгарнуць на тэрыторыі БССР базу для сваёй падрыўной работы супроць Совецкага Саюза.

З усёй яснасцю ўяўляюць сабе гэты каварны план ворага дэлегаты менскай гарадской партыйнай канферэнцыі. Вось чаму ў спрэчках яны жорстка крытыкуюць гарком за забыццё ў сваёй практычнай рабоце капіталістычнага акружэння РСФСР і пагранічнага становішча Менскага раёна. У калгаса «Прагрэс» былы брыгадзір Аксеневіч Хведар, Кваткоўскі Анатолій (які з'яўляецца сынам былога ўпраўляючага) і Кваткоўскі Алесь. Апошні кожны год працаваў на жнярцы, і кожны год ад яго «работы» падалі коні.

Разбуральнікі калгаса, каб выклікаць незадаволенасць калгаснікаў, пачалі іх яўна тэрарызаваць. Быў такі выпадак. У канцылярыі сядзелі Дражань В., Аксеневіч Ф. і Кваткоўскі Анатолій. Заходзіць загадчык малочнай фермы т. Базан і просіць Аксеневіча адправіць падводу за сенам для цялят. Дражань устае з-за стала і патрабуе, каб Базан выйшаў з канцылярыі. Калі-ж той не паслухаўся, усе ўтраіх выкінулі яго на двор.

Другі выпадак, які здарыўся з калгаснікамі-ўдовамі Агапай Бруй і Ганнай Міхневіч. Яны прышлі ў кладовую атрымаць па накладной хлеб. Кладаўшчык Апанас Сыцько, каб разлаваць калгасніц, выдаў ім замест чыстага збожжа субор, і пачаў агітаваць супроць калгаса.

Адкрытая дзейнасць класавых ворагаў прывяла калгас да вялікага прарыву. Гэта яны сарвалі веснавую сяўбу.

Калгаснік Н. МІКОЛА.



Стаханавец такарнага цэха завода імя Варашылава (Менск) тав. Кітайчык дабіўся выканання новых норм на 150 проц. НА ЗДЫМКУ: тав. Кітайчык за апрацоўкай дэталей да свідравальнага станка.

Фото Я. Салавейчыка.

ПРОФБЮРАКРАТЫ З ДЗЯРЖБАНКА

Мясцком саюза Беларускай канторы Дзяржбанка, які яднае каля 400 чалавек, працуе вельмі дрэнна. Старшыня мясцкома Яцыковіч зацісканае крытыку і самакрытыку. На пматлікія выступленні наспентазеты ён не рэагуе.

Нядаўна прафорг Шэйбак і касірша Рубенчык, заўважыўшы, што загадчык касай пераўчоту Якутовіч крадзе грошы, заявілі пра гэта адміністрацыі. Намеснік дырэктара банка тав. Пузанаў рэагаваў на гэтыя сігналы своеасабліва. Загадам ён звальняе з работы тав. Рубенчык, а комсамолку Шэйбак пераводзіць на ніжэйшую пасаду за... кампраметацыю Якутовіча. Праз некаторы час Якутовіч быў злоўлен на месцы злачынства і асуджан пролетарскім судом.

Між іншым, свой загад Пузанаў узгадніў з Яцыковіч. Гэты антыпартыйны ўчынак комуністаў Пузанава і Яцыковіч прайшоў па-за ўвагаю партыйнага камітэта. Тут гэта прынялі за «звычайную дробязную» рэч.

Былы старшыня мясцкома Канеўская растрапіла 500 руб. профсаюзных грошай і растранжырвала маемасць мясцкома. Рэвізійная камісія ўжо даўно зрабіла свае вывады, але мясцком дагэтуль утойвае акт рэвізіі і не даводзіць да ведама членаў саюза.

Кіраўнік банка тав. Галятоўскі незаконна прэміраваў грашыма і патэфонам растратчыка і аферыста былога старшыню ЦП саюза фінбанкаўскіх работнікаў Гераўкера.

27 мая ў банку быў партыйны сход. У парадку дня стаялі два пытанні—абмеркаванне рашэнняў VI пленума ВЦСПС і заява старшыні мясцкома Яцыковіч на былога сакратара парткома Кротава аб тым, што ён... не вітаецца з ёю. Цікава, што першаму пытанню было ўдзелена ўсяго 10 мінут, а другому—5 гадзін 50 мінут.

У Яцыковіч ляжаць па два месяцы дзесяткі заяў ад хворых членаў саюза, ал выдатнікаў аб пасылцы іх у дом адпачынку. Але ніхто не збіраецца нават разглядаць іх.

Такая гнілая атмасфера стварылася ў рабоце профсаюзнай і партыйнай арганізацый канторы Дзяржбанка.

ХАХЛОЎ.

УДАСКАНАЛЕНЫ ШТУРХАЧ ДЛЯ ЦЫРКУЛЯРНАЙ ПІЛЫ

Нярэдка ў працэсе пілення на цыркулярнай піле з ручной падачай матэрыялу рабочы, захоплены работай, не заўважае, што яго прыстасаванне для штурхання драўляных брусаў сваім завостраным канцом заклініваецца з размаху паміж брусом і цыркулярнай пілой. Пры такім працэсе сагнутая ў кулак рука рабочага з сілай налятае на дыск цыркуляркі, які хутка круціцца.

З-за гэтага цыркулярны кругапільны варштат адносіцца да найбольш небяспечнага, з пункту гледжання магчымасці траўмы, віду абсталявання. Адзін з карэспандэнтаў менскага навукова-даследчага інстытута аховы працы, інжынер Арлоў прапанаваў канструкцыю спецыяльнага ўдасканаленага штурхача для цыркулярных піл. Штурхач вельмі просты па сваёй будове і зусім танна абыходзіцца. Ён выробляецца з дрэва мяккай пароды. Па сваёй форме ён нагадвае ручную нажовачную пілу. Рукаятка яго робіцца з такім разлікам, каб забяспечыць не толькі свабоднае ўваходжанне рукі рабочага, але і даць апошняй магчымасць згінацца ў кулак. На рукаятцы прымацоўваюцца металічныя ракавіны-засцерагальнікі, якія нагадваюць ручную аховy фехтавальнай рапіры.

Штурхач поўнасцю знішчае ўсякую магчымасць пакалечанняў. Ён спрыяе хуткаму руху рук, што забяспечвае стаханаўскія паказчыкі ў рабоце на цыркулярках. Прапанова Арлова правяралася на менскім заводзе імя Молатава і дала здаваль няючыя рэзультаты. Штурхач заслужыў самыя станоўчыя водгукі стаханаўцаў завода.

НА СХОДАХ АКТЫВАУ

У наркамаце аховы здароўя

Учора пачаў сваю работу сход актыва Наркамата аховы здароўя БССР. Памяшканне клуба медсанпрацы, дзе сабраўся сход, не змясціла ўсіх запрошаных (а іх было больш 200 чал.). У зале было душна і цесна. Пасяджэнне актыва пачалося са спазненнем на гадзіну.

У дакладзе наркома аховы здароўя т. Бурачэўскага аб мерапрыемствах па выкананню рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) у галіне аховы здароўя было вельмі многа дзяляцкіх разважанняў. Гаворачы аб парочным стылі работы наркамата, ганебных з'явах, якія маюць месца ў рабоце асобных лячэбных устаноў, дакладчык усё-ж не даў ім палітычнага аналізу.

Прыведзеныя асобныя агідныя факты злачынных адносін да хворых, да патрэб працоўных былі кваліфікаваны, як дрэнная сістэма работы, бюракратызм, ігнараванне законных патрабаванняў працоўных.

Яўнае шкодніцтва, якое мела і мае месца ў будаўніцтве лячэбных устаноў, дакладчыкам было ахарактарызавана, як дрэнная работа будаўнічага аддзела наркамата, які, моў, не справіўся са сваімі задачамі.

— Наркамат і я не ведаем сапраўднасці, не ведаем людзей, з якімі працуем, не звязаны з імі, мы павярхоўна знаёмімся з работай у раёне, — паўтараў некалькі раз дакладчык.

Гэта — сур'ёзнае самаабвінавачанне, гэта — сур'ёзны сімптом ідыёцкай хваробы—палітычнай бясклопатнасці работнікаў наркамата і яго наркома.

Пасля Пленума ЦК ВКП(б) ужо прайшло тры месяцы. За гэты час можна і трэба было «падлячыцца». Але, на жаль, у т. Бурачэўскага не знайшлося ні фактаў, ні прыкладаў, каб канкрэтна сказаць актыву, як ідзе перабудова работы наркамата ў адпаведнасці з рашэннем Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна.

Сёння — пачатак спрэчак. Трэба спадзявацца, што ўдзельнікі нарады актыва дапоўняць істотны прабел у дакладзе наркома, ускрыюць прычыны парочнай сістэмы работы, выкрыюць затаіўшыхся ворагаў у органах аховы здароўя і скажуць, як трэба працаваць па-новаму.

Г. ВЯРХОЎСКІ.

У Наркомгасе

Комунальныя прадпрыемствы сутыкаюцца штодзённа з мільённымі масамі працоўных. І задача кожнага кіраўніка — арганізаваць добрае іх абслугоўванне. Ворагі народу, пралезшы на комунальныя прадпрыемствы, імкнуліся выклікаць незадаваленне насельніцтва, але рад кіраўнікоў комунальнай гаспадаркі з-за сваёй палітычнай слепаты ўсе сур'ёзныя сігналы зводзяць да простых «тэхнічных» непаладкаў. Іменна метады дзеяння ворагаў не былі як след паказаны на сходзе актыва Наркомгаса. Чатыры дні прадаўжаўся сход актыва. Кіраўнікі наркамата фактычна не кіравалі гэтым важнейшым сходам. З 200 удзельнікаў у зале прысутнічала ў сярэднім не больш 90—100 чалавек. Спрэчкі не былі накіраваны па правільнаму рэчышчу, не былі ўзняты на прынцыповую палітычную вышыню.

Не абыйшлося і без чэсных балбатуноў, якія ў сваіх выступленнях займаліся агульнымі разважаннямі і палітычнай трасакатнёй. Дырэктар энергакіраўніцтва тав. Дэніс не расказаў актыву аб прычынах агіднай работы яго сістэмы. Менскія электрастанцыі выключылі ў першамайскія дні чыгуначны вузел. На электрастанцыях дзесяткі аварый. Будаўніцтва станцый у пагранічных акругах і раёнах занятваецца. Аб гэтым тав. Дэніс умаўчаў.

Не менш агідная работа такіх важнейшых устаноў, як Белдзяржтранс і Белдзяржпраект, дзе зрываюцца важнейшыя дзяржаўныя мерапрыемствы. У Белдзяржпраекце засела група спецыялістаў, якая не дапускае маладых кадраў. Гэтыя спецы так «складаюць» праекты, што іх прыходзіцца перарабляць па тры-чатыры разы. Затрачваюцца велізарныя сродкі, а будаўніцтва важнейшых аб'ектаў затрымліваецца.

Белдзяржтранс мае вялікі аўтобусны парк, але чамусьці больш машын прастойвае ў гаражы, заўсёды ў рамонце. Факты гаворацъ за тое, што справа не ў гуме, на што спасылаюцца кіраўнікі. Тут больш сур'ёзныя прычыны. Аб гэтым чамусьці на сходзе гаварылі мімаходам і ўсё зноў-такі зводзілі да адсутнасці цвікоў, дэталей і інш.

Учора на сходзе выступіў з прамовай старшыня Соўнаркома БССР тав. Валковіч. Ён завастрыў увагу ўсіх удзельнікаў актыва на далейшае павышэнне большэвіцкай пільнасці на ўсіх участках сваёй работы.

Пасля заключнага слова наркома тав. Васермана сход закончыў сваю работу.

І. Т.

У кампазітараў

У спрэчках усё больш вырысоўваецца непрыглядная роля секцыі ў кіраўніцтве кампазітарамі. На гэтым участку ў выніку бяздзейнасці і прамога пасобніцтва з боку сэкцыі і яе старшыні т. Любана арудвалі доўгі час ворагі народу. Выступаючыя ў спрэчках гавораць, што Дрэйзіна, пасля выкрыцця ў кансерваторыі, Любан прыгравае ў Радыёкамітэце, забяспечвае яму да апошніх дзён цёпленькае месца.

Тав. Багатыроў указвае ў сваім выступленні і на той факт, што Любан быў звязан з ворагам народу Гіттарцам, і толькі пасля выкрыцця апошняга пачаў «раззбройвацъ» яго. А сігналы аб контррэволюцыйнай дзейнасці Гіттарца Любан меў раней усіх.

У секцыі пад крылцам Любана знаходзілі сабе прытулак рознага роду прахадзімцы. Авантурыст і прайдзісвет Лоткер неабмежавана карыстаўся сродкамі секцыі немаведама за якую работу. Любан, па дагаворанасці з трацкістам Фалкіным, арганізаваў выезд брыгады кампазітараў у Гомель, дзе, апрача п'янства і багемы, кампазітары нічога іншага насельніцтву не паказалі. Мэта гэтай паездкі і да гэтага часу нікому невядома. Выключна безгаспадарчае становішча ў секцыі са скарыстаннем дзяржаўных сродкаў. Падхалімства і сямейнасць, угодніцтва і «апалітычнасць» не далі магчымасці тт. Кротнеру і Палонскаму (рэвізійная камісія) ускрыць усё, што творыцца.

Выступаючыя (т. Ефімаў і інш.) указваюць, што Любан, а не хто іншы, узначальваў рапмаўшчыну, групоўшчыну. Гэта ён меў сувязь з ідэолагам рапмаўшчыны ў Маскве Лібедзінскім, які ўзнімаў Любана ледзь не да геніяў. Па ўказанню Любана лепшыя кампазітары БССР (Аладаў і інш.) у друку былі падвергнуты знішчальнай крытыцы. У практыцы работы секцыі заціраліся майстры музыкальнага фронта (Залатароў, Туранкоў і інш.), а ў творчым плане і па сённешні дзень мае месца шкодная тэорыя «малых форм». Усё гэта перашкаджае сапраўднаму росквіту музыкальнай культуры, тармозіць яе развіццё.

Асабліва трывожнае становішча ў БССР з музыкальным фальклорам. На гэтым участку ёсць яшчэ манапалісты (Сакалоўскі, Любан і іншыя), якія багаты матэрыял (сабраны ў часе паездак за кошт дзяржавы) трымаюць у партфелях.

У выступленнях тт. Цікоцкага і інш. была закранута падрыхтоўка кампазітараў да 20 гадавіны Вялікай социялістычнай рэволюцыі. Кіраўніцтва па справах мастацтваў тут праяўляе недапушчальную роўнадушнасць і не ведае фактычна, што робяць і што могуць зрабіць кампазітары БССР. Зусім малую ініцыятыву ў гэтым напрамку праяўляе і новая музыкальная адзінка — філармонія.

П. КАВАЛЁЎ.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА

АРГАНІЗАВАЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЬ ДАХАВЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

Перад прамысловасцю будматэрыялаў пастаўлена вельмі адказная задача па арганізацыі вытворчасці неметалічных дахавых матэрыялаў. У сучасны момант у Беларусі працуюць шэсць чарапічных заводаў Наркаммяспрома і рад чарапічных арцеляў промкаапераціі. Якасць выпускаемых дахавых матэрыялаў да гэтага часу нездавальняючая (менскі чарапічны завод). Рад буйных гарадоў (Гомель, Магілеў, Барысаў і інш.) зусім пазбаўлены вытворчасці дахавых матэрыялаў.

За гады трэцяй пяцігодкі трэба шырока фарсіраваць развіццё чарапічнай прамысловасці за кошт рэканструкцыі існуючых заводаў Наркаммяспрома, у прыватнасці, замяніць печы перыядычнага дзеяння больш удасканаленымі непарыўнага дзеяння сістэмы Гофмана і ўстанавіць агрэгаты для выпрацоўкі лентачнай чарапіцы.

Адначасова неабходна пабудаваць рад новых буйных чарапічных заводаў, па лініі Наркаммяспрома, для гарадскога будаўніцтва і шмат дробных заводаў, непасрэдна на тэрыторыі калгасаў па сістэме Наркамсэма для задаволення растучых патрэбнасцей калгаснага і соўгаснага будаўніцтва.

Да гэтага часу большасць сельскагаспадарчых пабудоў рабіліся з неагнетрывалага матэрыялу, галоўным чынам, з дрэва з саламянай страхой, з-за слабага развіцця цагельна-чарапічнай прамысловасці. Апрача таго, шырокія масы калгаснікаў не былі знаёмы з перавагамі чарапічнага агнетрывалага даху ў параўнанні з іншымі відамі, а таксама са спосабамі скарыстання прыродных багаццяў — глін для вырабу чарапіцы. Агнетрываласць чарапічнага даха набыла асаблівае значэнне цяпер, калі моцна развіваецца будаўніцтва ў калгасах. Саламяную страху трэба замяніць чарапічным дахам, як больш агнетрывалым і доўгавечным.

Чарапіца ў пажарных адносінах больш агнетрывала, чым ліставое жалеза, тым больш чым саламяная страха. Чарапіца не толькі не загараецца і не гарыць, але нават пасля пажару можа быць скарыстана для пакрыцця даха.

Яна мае дрэнную цеплаправоднасць, у выніку чаго яна летам моцна не награецца, а зімой рэзка не ахаладжваецца.

Чарапічны дах дастаткова трывалы, каб па ім дарослы чалавек мог свабодна хадзіць, не ламаючы асобных чарапіц.

Чарапічны дах не патрабуе афарбоўкі, як жалезны, і пастаяннага частага рамонту, як напрыклад, саламяная страха. Многія лічаць, што чарапічны дах вельмі няжкі і таму мала прыгодны для пакрыцця сельскіх пабудоў. Але гэта не адпавядае сапраўднасці, бо чарапічны дах набліжаецца па вазе да саламянай страхі (намокшай пад дажджом).

У БССР ёсць велізарныя запасы глін для выпрацоўкі чарапіцы. Толькі за адзін 1936 г. у Інстытуце прамысловасці праведзена выпрабаванне 500 проб глін з розных калгасаў БССР для вызначэння месца пабудовы цагельна-чарапічных заводаў. Чарапічны дах, які атрымаў вялікае распаўсюджанне ў Заходняй Еўропе, у нас павінен быць таксама максімальна развіты, але ў асноўным ён астаецца мясцовым дахавым матэрыялам.

Нараду з развіццём чарапічнай прамысловасці, мы павінны ў 3-й пяцігодцы арганізаваць вытворчасць іншых відаў неметалічных дахавых матэрыялаў, а іменна: асба-цэментных плітак (штучнага шыфера), толя і асабліва вытворчасць руберойда.

Толевыя, руберойдныя і жалезныя дахі вядома лягчай асба-цэментных, але затое менш трывалы і патрабуюць частага рамонту. Так, напрыклад, адзін квадратны метр даху (не лічачы абрашоткі) важыць з руберойда 3,2 кілограм; з асба-цэменту — каля 9,2 кг., глінянай марсельскай чараліцы 47,5 кг. Пры нармальнай якасці руберойдны дах можа трымацца 15—20 год, а шыферны да 50 год у той час, як тэрмін службы жалезнага даху не перавышае 25 год.

Па кошту эксплаатацыйных выдаткаў на адзінку пакрыцця руберойдны дах з'яўляецца адным з самых танных відаў даху, а шыфер у гэтых адносінах не мае канкурэнтаў. З пункту гледжання архітэктурнага афармлення будынкаў каляровыя руберойд і шыфер могуць задавальняць самым утончаным запатрабаваннем будаўнікоў. Цікава адзначыць, што ў Злучаных Штатах Амерыкі ўжо даўно перайшлі на каляровы руберойд. Пры новым цэментным заводзе (у Шасяроўцы) мэтазгодна запланаваць цэх па выпрацоўцы асба-цэментных плітак (шыфера). Калі ўлічыць, што ў масу для выпрацоўкі шыфера ўваходзіць 85—90 проц. цэменту і 10—15 проц. асбеста нізкіх гатункаў, то рэнтабельнасць арганізацыі такога цэха становіцца відавочнай. Што датычыць асбеста, то пуск у 1936 г. гіганцкай асбеставай фабрыкі № 3 палкам забяспечыць БССР у неабходным асбесце, тым больш, што баланс асбеста дазваляе нам экспартаваць яго ў значнай колькасці, а нізкія гатункі, годныя для шыфера, астаюцца ў лішку. Што датычыць толя і руберойда, то БССР па сваёй удзельнай вазе ў папяровай прамысловасці лёгка можа наладзіць вытворчасць неабходных асартыментаў картону а іншыя матэрыялы, як каменнавугальная смала, пека, нафтавыя бітумы, могуць быць лёгка завезены з іншых рэспублік Саюза.

Сыравінныя рэсурсы БССР з'яўляюцца надзейнай базай для стварэння ў Беларусі за гады трэцяй пяцігодкі магутнай прамысловасці дахавых неметалічных будматэрыялаў.

Старшы навуковы работнік Інстытута прамысловасці

І. П. РАЙГАРДЗЕЦКІ.

МАЕ ПРАПАНОВЫ

Пры складанні плана трэцяй пяцігодкі трэба звярнуць вялікую ўвагу на калгасы. Я прапаную ўвесці правільны севазварот з чорным папарам, наладзіць насенную гаспадарку. Сур'ёзную ўвагу трэба звярнуць на селекцыйную работу. У трэцяй пяцігодцы трэба мець ужо марозаўстойлівыя гатункі насення.

Для падняцця ўраджайнасці павялічыць завоз мінеральных угнаенняў, як суперфасфату, калійнай солі, сернакіслага амонія і інш., з такім разлікам, каб на 50 проц. угноіць поле мінеральным угнаеннем. Я таксама прапаную пазіць распэнкі на мінеральнае ўгнаенне.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на падрыхтоўку кадраў. Для гэтага патрэбна адкрыць у сельсоветах сельскагаспадарчыя школы для брыгадзіраў і звеннявых.

Севазварот павінен быць з правільным чаргаваннем плодазмены культур, як азімыя, яравыя, лён, прапашныя, канюшына. Нядрэнна расце ў нашай мясцовасці люцэрна, доннік.

Пры складанні плана трэба звярнуць велізарнейшую ўвагу на кармавую базу. Палепшыць сухадольныя сенажаці шляхам праворвання і залужэння лутавымі травамі, як аўсяніцай, мятлік, кастрэц, лісахвост і інш., якія даюць добраякаснае сена.

Адпусціць доўгатэрміновы крэдыт на меліярацыю, выпусціць больш машын па раскарчоўцы і асушэнні балот і апрацоўцы іх.

У галіне жывёлагадоўлі трэба палепшыць пароду буйнай рагатай жывёлы, шляхам завозу племянных быкоў-вытворнікаў.

Звярнуць асаблівую ўвагу на сцягванне хутароў.

Забяспечыць кожны калгас аўтамашынай.

Е. ЦЗЛІКАЎ.

Ордэнаносец, старшыня калгаса «Чырвоны гай», Рагачоўскага раёна.

АБ СПРАВАХ ЛІТФОНДА

Ворагі народа нямала нашкодзілі ў арганізацыях, якія створаны ўрадам для абслугоўвання совецкіх пісьменнікаў у іх карыснай творчай рабоце. Гэта асабліва высветлілася за апошні час у сувязі з выкрыццём трацкісцка-авербахаўскай банды ў літаратуры.

У беларускім аддзяленні літфонда таксама знаходзіліся людзі, якія фактычна выконвалі дырэктывы ворагаў, невыпадкова ўсімі вялікімі матэрыяльнымі выгодамі літфонда карысталіся ворагі народа, розныя прайдзісветы і проста лоўкія хапуны.

Дзесяткі тысяч рублёў дзяржаўных сродкаў папалі ў рукі ворагам. Так, Вольны атрымаў больш двух тысяч рублёў безазвротнай дапамогі, Зарэцкі — каля двух тысяч, Чарот — тры тысячы, Гартны, Стаўскі, Звонак, Каваль, Шашалевіч па адной-дзве тысячы. Усе яны апроч гэтага па некалькі разоў атрымлівалі самыя дарагія пуцёўкі на курорты і ў санаторыі. Лепшыя кватэры аддаваліся ім-жа ў той час, як таленавітыя маладыя кадры беларускіх і яўрэйскіх пісьменнікаў не мелі мінімальных умоў для творчай работы.

Мала гэтага, літфонд у асобе былога дырэктара, члена партыі Лейзерава абсталёўваў за дзяржаўныя сродкі кватэры ворагам народа. А асобныя кіруючыя работнікі праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў і асабліва член партыі Гурскі гаўзята хадайнічаў перад калгасам аб водпуску ўчастка зямлі для пабудовы дач контррэволюцыйным нацдэмам, якія з'явіліся пасля месцам для злёту ворагаў на свае «нарады». Не раз з ворагамі народа на гэтых дачах прымаў удзел у п'янках і сам Гурскі.

Ворагі не забылі паслуг Гурскага. Прабраўшыся ў кіраўніцтва, яны вызначылі яму прэмію ў 1000 рублёў з поўнай санкцыі і згоды Александровіча.

Паразітычнае існаванне «канавалаў ад літаратуры» было вядома кіраўніцтву саюза совецкіх пісьменнікаў. Але кіраўнікі саюза і праўленне літфонда (Александровіч, Гурскі, Галавач, Лынькоў) доўгі час падкармлівалі ворагаў народа, пеставалі фашысцкіх выродкаў, даючы такім чынам магчымасць іх існаванню і дзейнасці.

Асабліва не скупіліся Александровіч і Гурскі на сродкі для наладжвання бязлікіх папоек у Доме пісьменнікаў. Багема дайшла да таго, што папойкі Александровіч і Гурскі наладжвалі па ўсялякіх выпадках і без апошніх.

У апараце літфонда працавалі і працуюць яшчэ людзі, якія старанна забяспечвалі ворагаў народа і сябе па ўказанню тых-жа Лейзерава і Александровіча, не шкадуючы дзяржаўных сродкаў.

Былы дырэктар літфонда Лейзераў (працуе зараз у Нафтазбыце) «за добрасумленнае выкананне абавязкаў» сам сябе прэміраваў (толькі за 5—6 месяцаў «працы») больш, як на дзве тысячы рублёў, а свайго памочніка бухгалтара Багдановіча, які і зараз «працуе» ў літфондзе, прэміраваў на суму ў 2.150 руб. Гэты-ж Багдановіч фактычна распараджаўся грашыма літфонда, як сваёй кішэняй, і ўсякія асновы фінансавай дысцыпліны груба парушаў, а да адказнасці, як і Лейзераў і іншыя, не прыцягнут.

Сённешняе становішча літфонда, бесшабашнае і антыдзяржаўнае скарыстанне сродкаў у доме адпачынку пісьменнікаў у Пухавічах, справы таварыства па ахове аўтарскіх правоў і секцыі драматургаў патрабуюць сур'ёзнай увагі слечных органаў.

Тыя, хто дзяржаўнымі сродкамі карміў ворагаў народа, дапамагаў у іх шкоднай контррэволюцыйнай дзейнасці, павінны атрымаць па заслугах.

К. ПАЎЛАЎ.

АКТ АДКРЫТАЙ ІНТЭРВЕНЦЫІ

Не паспелі члены Совета Лігі нацый азнаёміцца з дакументамі «Белай кнігі» іспанскага ўрада аб жахах фашысцкай інтэрвенцыі, і не паспелі яны прыняць чарговую рэзалюцыю па іспанскаму пытанню і ўхваліць мерапрыемствы камітэта па неўмяшанню, як свет апынуўся сведкай новага нечуванага злачынства германскага фашызма.

Бутарка ідзе аб правакацыйным абстрэле германскім ваенным караблём «Дэйчланд» іспанскіх урадавых самалётаў і варварскай бамбардыроўцы паўднёвага порта Альмерыі.

Акт самаабароны з боку іспанскіх самалётаў, справакаваны германскім ваенным караблём, з'явіўся повадам для адкрытай разбойніцкай вайны з іспанскім народам.

Апрануўшы на сябе лічыну «нявіннага агнца», «афіры агрэсіі», фашысцкая Германія патрабуе ад патураючых ёй дзяржаў неадкладных мер у адносінах «іспанскіх варвараў, напаўшых на германскі карабль, які праводзіў функцыі кантролю ў іспанскіх водах». Бамбардыроўку Альмерыі, дзе забіты і паранены дзесяткі мірных жыхароў, фашысцкія канібалы выдаюць за акт «законнай рэпрэсіі».

Знайшліся ў Англіі абаронцы «прыгнечаных і пакрыўджаных», якія імкнуцца апраўдаць дзеянні агрэсара.

Між тым усяму свету вядома, што Балеарскія астравы, у прыватнасці востраў Івіса, з'яўляюцца зонай французскага кантролю, і германскі ваенны карабль «Дэйчланд» знаходзіўся ў парту Івіса спецыяльна для мэт шпіянажу і дапамогі мяцежнікам. Гэты карабль пад сцягам «кантролю» ўжыў страшэнную правакацыю, каб пачаць адкрытую вайну з Іспаніяй.

Прыкладу фашысцкай Германіі паслеваў яе італьянскі саюзнік. Італьянская падводная лодка без папярэджання патапіла іспанскі пасажырскі параход «Сіудад дэ Барселона», ужо агледжаны кантралёрам камісіі па неўмяшанню. Загінула 180 пасажыраў.

Гэтыя агрэсіўныя акты германскіх і італьянскіх інтэрвентаў выклікаюць законную трывогу ва ўсіх прыхільнікаў міру.

Скарыстаўшы справакаваны інцыдэнт, інтэрвенты паспяшылі абвясціць аб сваім выхадзе з лонданскага камітэта па неўмяшанню, які быццам не можа гарантаваць «безапаснасць суднаў, якія праводзяць кантроль». Нават баязлівыя, палавінчатыя, нерашучыя мерапрыемствы камітэта звязвалі рукі агрэсарам.

Вышаўшы з лонданскага камітэта, яны расчысцілі сабе шлях для адкрытай вайны, для пасылкі новых часцей, новых караблёў, новых самалётаў у Іспанію. Паражэнне італьянскіх войск пад Гвадалахарай, апошнія няўдачы часцей інтэрвентаў, якія наступаюць на Більбао, штурхаюць агрэсараў на шлях адкрытай, яшчэ больш шырокай дапамогі фашысцкім мяцежнікам. Неларма германскі ўрад пагражае Іспаніі «свабодай дзеянняў», «прымяненнем зброі супроць кожнага іспанскага самалёта і карабля, якія наблізяцца да германскіх ваенных сіл».

Пагроза перарастання іспанскага канфлікта ў міжнародны пажар з кожным днём нарастае. Фашысцкія агрэсары граюць з агнём.

ПРАВАКАЦЫЯ ГЕРМАНА-ІТАЛЬЯНСКІХ ІНТЭРВЕНТАЎ

Канцэнтрацыя германскага флота ля іспанскіх берагоў

БЕРЛІН (сталіца Германіі), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Сёння ў іспанскія воды вышаў германскі крэйсер «Лейпцыг». Іншыя ваенныя караблі, як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, адправяцца ў Іспанію ў бліжэйшыя дні.

* * *

ПАРЫЖ (сталіца Францыі) 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Радыё з Гібралтара (англійская крэпасць на паўднёвай аканечнасці Пірынейскага поўвострава) пасажыры англійскага парахода бачылі ў Міжземным моры 11 германскіх ваенных суднаў, у тым ліку падводныя лодкі, якія на ўсіх парах накіроўваліся да Іспаніі.

* * *

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае з Гібралтара, што германскі крэйсер «Дэйчланд», які накіроўваўся на захад, змяніў курс і накіраваўся ў бок Альмерыі (порт на поўдні Іспаніі).

Дыпламатычныя шагі Англіі

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе: пасяджэнне лонданскага камітэта па неўмяшанню не адбудзецца аж да сканчэння дыпламатычных перагавораў, якія адбываюцца ў сувязі з апошнімі інцыдэнтамі ў іспанскіх водах. Дыпламатычныя перагаворы, якія адбываліся учора, мелі на мэце змякчыць стварыўшуюся напружаную абстаноўку і пазбегнуць паглыблення канфлікта. Брытанскі ўрад падтрымлівае цесны кантакт з прадстаўнікамі астатніх урадаў — удзельнікаў камітэта па неўмяшанню. Кантакт падтрымліваецца з мэтай: 1) выпрацаваць схему, якая-б папярэджвала паўтарэнне магчымых інцыдэнтаў з ваеннымі караблямі дзяржаў, што ажыццяўляюць морскі кантроль і 2) знайсці магчымасць папаўнення кантрольнай службы ў сувязі з часовым уходам германскіх і італьянскіх патрульных караблёў».

* * *

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 1 чэрвеня (БЕЛТА). Паводле слоў кансерватыўнай газеты «Морнінг пост», Англія лічыць, што неабходна прыкласці ўсе намаганні к таму, каб вярнуць Германію і Італію ў міжнародны камітэт у найкарацейшы тэрмін. У рэзультаце адмаўлення Германіі і Італіі ад удзелу ў морскім кантролі ўскладнае ўзбярэжжа Іспаніі астаецца вольным ад кантролю. «Таму, — піша газета, — у інтарэсах Германіі і Італіі — аднавіць супрацоўніцтва як мага хутчэй, калі ў іх няма намеру поўнасцю адмовіцца ад пагадзення па неўмяшанню».

Згодна заявы найбольш уплывовай кансерватыўнай газеты «Таймс», у англійскіх колах выражаюць жаль па поваду інцыдэнта з броненосцам «Дэйчланд», а таксама па поваду бамбардыроўкі Альмерыі, але не пераўлічваюць сур'ёзнасць становішча.

У гэтых колах моцна спадзяюцца, што шкода, нанесеная неўмяшанню, будзе часовай.

Паведамленне агенцтва Гавас

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе: «Ваенныя ўлады абвяргаюць чуткі, быццам два французскія ваенныя караблі атрымалі загад пакінуць неадкладна Тулон (ваенны порт на поўдні Францыі) і накіравацца ў Іспанію. На самой справе маюць месца толькі прадугледжаныя раней перамяшчэнні для замены караблёў, якія прымаюць удзел у кантролі ля ўзбярэжжа Іспаніі».

Баскскія дзеці ў Англіі. 23 мая ў Соутгемптон (Англія) прыбыла вялікая група баскскіх дзяцей з Більбао. Дзеці будуць размешчаны ў лагеры Стоунхем у 8 клм. ад Соутгемптона. НА ЗДЫМКУ: дзеці ў цырульні перад адпраўкай у лагер. (СФ).

ПАСЛЯ БАМБАРДЫРОУКІ АЛЬМЕРЫІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас з Альмерыі (порт на поўдні Іспаніі), 1 чэрвеня адбылося пахаванне афіяр бамбардыроўкі Альмерыі германскімі ваеннымі суднамі. З будынкаў асабліва папярэлі сабор, клініка хуткай дапамогі, мексіканскае консульства, іспанскі крэдытны банк, школа мастацтваў і рамёслаў і вялікая гасцініца «Сімон», размешчаная ў цэнтры горада.

Раніцою Альмерыя стала ажыўляцца. Жыхары спускаюцца з гор, вяртаюцца ў разбураныя жыллёвыя памяшканні, шукаюць прапаўшых. Вядуцца работы па ачыстцы вуліц ад абломкаў.

УРАДАВЫ КРЫЗІС У ЯПОНІІ

ТОКІО (сталіца Японіі), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Імператар даручыў старшыні верхняй палаты князю Коное сфарміраваць новы габінет. Коное прыняў даручэнне.

На думку агенцтва, Коное перш за ўсё будзе высвятляць адносіны ваенных улад да свайго назначэння.

* * *

ТОКІО, 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Газеты ападушна выражаюць задавальненне адстаўкай урада Хаясі, падкрэсліваючы, што ёй апіраўся толькі на сілы, па сутнасці, не звязаныя з канстытуцыйным ладам. Вялікая ўвага ўдзяляецца паведамленням, якія сцвярджаюць, што нават у ваенных колах задаволены правалам урада Хаясі, паколькі гэтыя колы ўпэўніліся ў поўнай яго негрунтоўнасці.

У той-жа час вялікі інтарэс выклікаюць аднадушныя сцвярджэнні газет, што ваенныя колы, пераканаўшыся ў немагчымасці нармальнага функцыянавання ўрада, які не супрацоўнічае ў той або іншай меры з палітычнымі партыямі, прышлі да вываду, што новы ўрад павінен быць «моцным нацыянальным урадам». У яго павінны ўвайсці прадстаўнікі морскіх і ваенных улад, бюракратыі, палітычных партый, фінансавых колаў. Яго задача — правядзенне «палітыкі рэформ».

Ваенны міністр Сугіяма ў сваёй заяве, зробленай ноччу 31 мая, падкрэсліў, што якім-бы ні быў новы ўрад і незалежна ад таго, ці паследуе перамена на пасту ваеннага міністра, «асноўная палітыка арміі астаецца пазменнай».

АДКРЫЛАСЯ СЕСІЯ БЮРО КАНФЕРЭНЦЫІ ПА РАЗЗБРАЕННЮ

ЖЭНЕВА (горад у Швейцарыі, месцапрабыванне Лігі нацый), 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Учора адкрылася сесія бюро канферэнцыі па разззбраенню. Ад СССР прысутнічаюць Літвінаў і паўпрэд СССР у Рыме Штэйн. Прадстаўнік Францыі Поль Бонкур прапанаваў заключыць канвенцыю аб гласнасці ваенных бюджэтаў і аб стварэнні камісіі для наглядання за выкананнем такой канвенцыі. Прадстаўнік ЗША Вільсон заявіў, што пытанне аб разззбраенні знаходзіцца ў парочным колі эканамічных і палітычных праблем, але што асноўнай крыніцай сусветнага непакою з'яўляецца наяўнасць «эканамічнага ўзбраення», якое ўсё павялічваецца.

Вільсон лічыць, што трэба рэкамендаваць урадам узяцца за гэту праблему і вярнуцца да палітычных пытанняў толькі тады, калі вырашэнне гэтай праблемы дастаткова далёка прасунецца наперад.

Крэнборн (Англія) паведаміў бюро аб становішчы двухбаковых морскіх перагавораў, якія вядуцца па ініцыятыве яго ўрада, і выказаў надзею, што пяпер удасца заключыць усеагульнае пагадненне аб абмежаванні морскіх узбраенняў. Пакуль што Англія будзе выконваць сваю праграму даўзбраенняў, лічачы, што гэтым яна ўмацуе справу міру, бо яе ўзбраенні служаць толькі для самаабароны і для выканання міжнародных абавязацельстваў.

Крэнборн згадзіўся з прапановай Бонкура, указваючы, што можна запытаць усе ўрады, ці гатовы яны прынцыпова пайсці на гласнасць ваенных бюджэтаў.

* * *

ЖЭНЕВА, 31 мая (БЕЛТА). Брытанская дэлегацыя прадставіла сесіі бюро канферэнцыі па разззбраенню ноту, у якой паведамляе аб ходзе двухбаковых морскіх перагавораў, пачатых па ініцыятыве брытанскага ўрада, і выказвае надзею, што іх паспяховае завяршэнне «аблегчыць заключэнне генеральнага дагавору аб абмежаванні морскіх узбраенняў». Нота паведамляе, што брытанскія перагаворы з савецкім і германскім урадам значна прасунуліся, і выказвае надзею, што «пагадненні з Вялікабрытаніяй будуць падпісаны адначасова Германіяй і СССР у недалёкім будучым».

ПАРУШЭННІ ПАСТАНОВЫ АБ ЗНІЖЭННІ ЦЭН

ВІЦЕБСК, 1 чэрвеня. Практычнае ажыццяўленне пастановы ўрада аб зніжэнні цэн віцебская гандлёвая сетка сустрэла неарганізавана. У універмагу Белпрамгандля (лырактар магазіна т. Бер) прадажныя цэны за парфумерыю зніжаны, але ні старыя, ні новыя цэны на таварах не ўказаны. У футравым аддзяленні гэтага магазіна на асобных таварах (гаржэткі заячыя і інш.) яшчэ ўказаны старыя цэны. Ярлыкоў новых цэн няма. У абутковым аддзяленні таго-ж магазіна вялікая колькасць абутку мясцовай вытворчасці зусім не пераацэнена. Гэты абутак у продаж не пушчан.

Такое-ж становішча і ў магазіне № 5 «Саюзхарчмага» (лырактар магазіна т. Баскін). Туалетнае мыла таксама не пераацэнена і ў продаж не пушчана. Па гэтай сістэме Саюзхарчмага выяўлены факты грубага парушэння пастановы ўрада па зніжэнню цэн. У магазіне №7 папяросы вышэйшага гатунка «Строим», «19 Октябрь» і інш. сёння прадаваліся па старой цане— 3 р. за каробку ў 25 шт. і 1 р. 20 к. за дзесятак, у той час, калі гэты гатунак папярос належаў зніжэнню на 10 проц. Распараджэнне магазіну — прадаваць па старой цане даў дырэктар віцебскага аддзялення Саюзхарчмага т. Хоіствер і галоўны бухгалтар Соркін.

У большасці магазінаў горада няма плакатаў з указаннем старых і новых цэн. Ва многіх магазінах на таварах адсутнічаюць ярлыкі з указаннем новых цэн. Асобныя магазіны (футравы магазін па вуліцы імя «Правды» і інш) у сувязі з тым, што папярэдне не паспелі зрабіць пераацэнку тавараў сёння зусім закрыты.

Арк. Зарубежны.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКІ КАМПАЗІТАР

Зала доўга апладыравала. Пасля, калі ўлёгся шум, хор з 30 чалавек, суправаджаемы аркестрам народных інструментаў, выканаў песню донскіх казакаў. Кожны раз, пасля невялікага прыпеву, на пярэдні план выходзілі два чырвонаармейцы, пераапранутыя ў народныя казацкія касцюмы, і пускаліся ў плясавую. Гэта была прыгожая, бадзёрая, жыццерадасная песня. Яна карысталася вялікім поспехам у прысутлых на вечары самадзейнасці.

...На сцэну вышаў нізкага росту, але моцна складзены чалавек. Ён нясмела, але радасна ўсміхаўся і няўмела кланяўся ў адказ на доўгія апладысменты.

Гэта і быў аўтар музыкі да песні аб совецкіх донскіх казаках, чырвонаармейскі кампазітар Георгій Сасулін.

* * *

У армію Сасулін прышоў у 1931 годзе. Пасля адбыцця тэрміну службы ён астаўся на звыштэрміновую. Сасулін захапляўся музыкай і спрабаваў самастойна напісаць некалькі песень. Ён упорна працаваў і вучыўся. Вечарамі Сасулін сядзеў над музыкальнымі падручнікамі, авалодваючы майстэрствам кампазітарскай справы. Нарэшце ён напісаў літаратурна-музыкальны мантаж «Гісторыя Н-скай дывізіі». Нач. палітаддзела ўхваліў яго.

Чырвонаармейцы паважаюць і цэняць свайго кампазітара. Сасулін напісаў музыку на словы нашых лепшых паэтаў. Зараз уся Н-ская часць распявае яго баявую, выдатную песню:

Если в злобном напряженьи
Нас ударит вражий гром,
Поведут в дыму сражений
Командир и военком.

І. БАЗ

МАЎСТРЫ КАМБАЙНАВАЙ УБОРКІ

За добрае асваенне тэхнікі, дасканалае веданне паўночнага камбайна, а таксама за высокую выпрацоўку на ім (больш 200 проц.) Наркамзем Саюза прысвоіў званне майстроў камбайнавай уборкі камбайнерам БССР тт. Ф. С. Лойка (Старобінская МТС), М. М. Ермалкевічу (Путчынская МТС) і К. І. Шумскаму (Дзержынская МТС). Майстрам камбайнавай уборкі выдаецца спецыяльны значок і пасведчанне.

АРТЫСТЫ НА СПЛАВЕ

Беларускі рэспубліканскі камітэт профсаюза рабочых лесасплаву заключыў дагавор з 2-м Беларускім дзяржаўным тэатрам на абслугоўванне спектаклямі рабочых-сплаўшчыкаў. Склад артыстаў тэатра разбіваецца на тры брыгады, якія будуць абслугоўваць сплаўшчыкаў Днепра-Бярэзінскага басейна, Прыпяцкага, Сожа і Заходняй Дзвіны. З 5 па 27 чэрвеня брыгады артыстаў дадуць 50 пастановак.

ПАБУДАВАНА ПАРАШУТНАЯ ВЫШКА

У гарадскім парку г. Чэрыкава ўрачыста была адкрыта 25 мая новапабудаваная парашутная вышка. Вышыня яе 35 метраў, кошт 16 тысяч руб. Моладзь раёна мае вялікае жаданне авалодаць парашутным спортам. Першыя свае крокі ў гэтым напрамку яна будзе рабіць са сваёй парашутнай вышкі.

ЦЕРУШКІН, РЫСІН.

СЕНАКОС

АСВЕЯ. Калгас імя Молатава, Кісялёўскага сельсовета, 30 мая пачаў касьбу. Скошаны і ўбраны з поля першыя чатыры гектары.

Да сенакашэння прыступіў таксама калгас імя Энгельса, гэтага-ж сельсовета.

* * *

НАРОЎЛЯ. Першым па раёну распачаў касьбу калгас імя Першага мая. За першы дзень скошана 7 гектараў. Некаторыя касцы выконваюць нормы на 200 проц. (БЕЛТА).

АЎТА-МОТАГОНКІ МЕНСК—МАСКВА

Разгорнута вялікая падрыхтоўка да скарасных сустрэчных аўта-мотагонак па маршрутах Менск—Масква і Масква—Менск. Лепшыя аўтагоншчыкі БССР тт. Прыбыткоўскі, Станілевіч, Цішкевіч і іншыя праверылі гэтымі днямі трасу, даставіўшы з Масквы ў Менск сваім ходам 12 аўтамашын маркі «ГАЗ-А», якія прадназначаны для аўта-мотаклубаў рэспублікі.

Гонкі па гэтаму маршруту праводзяцца ўпершыню. У іх прымуць удзел каманды Масквы і Менска; у складзе кожнай 5 аўтамашын і 5 матацыклаў. Па ўмовах, гэта — скарасныя безастановачныя гонкі. Матацыклам дазваляецца спыняцца на спецыяльных пунктах для запраўкі гаручым. На кожнай машыне будзе па аднаму вадзіцелю і аднаму механіку. Максімальны час, у які павінны прайсці машыны ўвесь шлях (каля 860 кілометраў), устаноўлен для аўтамабіляў 15½ гадзін, для матацыклаў 18 гадзін.

Старт гонкам даецца адначасова ў Маскве і Менску 24 чэрвеня ў 1 гадз. 30 мін. ночы. Да гонак рыхтуюцца лепшыя гоншчыкі рэспублікі тт. Прыбыткоўскі, Саламонаў, Станілевіч, Шыркевіч, Лебедзеў, матацыклісты Верапіленка, Казлоў, Уціралаў, Камсюк, Акуленка. У бліжэйшыя дні яны аноў праверяць маршрут гонак.

[illegible] працуюць. Вось, напрыклад, партарганізацыя завода імя Варашылава за ўвесь час з моманту апублікавання пісьма ЦК ВКП(б) аб аднаўленні прыёму ў партыю не прыняла ні аднаго чалавека. Не лепш і ў другіх арганізацыях.

Я хачу спыніцца на рашэнні ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб вызваленні тав. Галадзеда ад паста старшыні Соўнаркома.

Пасля апублікавання гэтага рашэння мне прыходзілася гаварыць з радам таварышоў, і думаю, што правільна выкажу настрой усёй нашай партыйнай арганізацыі, калі скажу, што гэта рашэнне з'яўляецца своечасовым і правільным, аблюстроўваючым сапраўдныя большэвіцкія настроі нашай арганізацыі.

Мне, як работніку сяла, прыходзілася вельмі часта сутыкацца з дзейнасцю Соўнаркома, які ўзначальваў т. Галадзед. У нас, у сельскіх работнікаў, быў такі настрой, што калі хочаш угрох[illegible] Сойтак

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»

СЁННЯ І ШТОДЗЕННА

НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

Возвращение Максима

ДРУГАЯ СЕРЫЯ ФІЛЬМА «ЮНАСЦЬ МАКСІМА»

НА ЛЕТНЯЙ ЭСТРАДЗЕ ЛЕНІНГРАДСКІ КАНЦЭРТНЫ ДЖАЗ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ Э. КОРЖЭНЕЎСКАГА.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра — БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА. Абан. № 54. КАНЕК-ГАРБУНОК

Памяшканне Белдзярж. драмтэатра — ГАСТРОЛІ МАСКОЎСК. ТЭАТРА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. ГОД 19-ты

Дзіцячы гукавы кінотэатр АЙ-ГУЛЬ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» «ЖАНІЦЬБА» (па Гогалю) на летняй эстрадзе — джаз-аркестр

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Гукавы кінотэатр «Спартак» ДАРЫКО

РАДЫ�ЕПЕРАДАЧЫ НА 8 ЧЭРВЕНЯ:

8.30 — «Апошнія паведамленні». 16.05 — канцэрт. 17 — канцэрт для дзяцей. 18.30 — завочная партвучоба. 19.45 — канцэрт. 20 — перадача ў дапамогу самаадукацыі. 20.15 — канцэрт. 20.30 — літаратурна-музычная перадача на яўрэйскай мове. 23 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — перадача на польскай мове.

ДЗЯРЖЦЫРК (Сад імя Горкага, тэл. 22-725). 4 чэрвеня АДКРЫЦЦЁ ЛЕТНЯГА СЕЗОНА

Вялікае цыркавое прадстаўленне ў трох аддзяленнях.

Лепшыя совецкія, замежныя нумары і атракцыёны.

Пачатак у 9 г. вечара. Каса — з 12 да 2 і з 5 да 10 г. веч.

Прымаюцца заяўкі на стальныя месцы са скідкай.

ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ПАДПІСКА на ўсесаюзную штодзенную газету „За пищевую индустрию“ ПРЫМАЕЦЦА на 2-е поўгоддзе 1937 года ўсімі паштовымі аддзяленнямі і райбюро Саюздрука БЕЗ УСЯКІХ АБМЕЖАВАННЯЎ.

КУРАНЯТЫ

ВЫСОКАПРАДУКЦЫЙНЫЯ ЧЫСТАПАРОДНЫЯ „БЕЛЫ ЛЕГОРН“

ПРАДАЮЦЦА ўсім У НЕАБМЕЖАВАНАЙ КОЛЬКАСЦІ як ЗА ГРОШЫ, па пашпарце:

ЧЫСТАПАРОДНЫЯ — 1 р. штука і МЕТЫСНЫЯ — 85 кап. штука, таксама і ў АБМЕН НА ЯЙКІ. За кожнае куранё патрэбна здаць на інкубатарную станцыю 2 яйкі і дапланіць 25 кап.

ВОДПУСК КУРАНЯТ праводзіцца з наступных ІНКУБАТАРНА-ПТУШКАВОДНЫХ СТАНЦЫЙ.

У ГАРАДАХ: МЕНСК, ІПС — вул. Апанскага, 58; ГОМЕЛЬ — Нямецкая, 9; ОРША — Совецкая, 28; ПОЛАЦК — Запалоцце, Міхіраўская, 13; СЛУЦК — вул. Парыжскай Камуны, 43; КАЛІНКАВІЧЫ — інкубатарная станцыя;

БАБРУЙСК — Цагельная, 6; БАРЫСАЎ — Розы Люксембург, 11/26, ЛЕПЕЛЬ — Базарная, 11

У РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ: Крычаў, Гарадок, Дрыса, Асіпавічы, Будчакалева, Хойнікі, Копысь — калгас «Кастрычнік», Стара-Копыльскага сельсавета.

ДАВЕДКІ можна атрымаць: Дом урада, Наркамзем БССР, пакой № 123, тэл. 22-605.

РЭДАКЦЫІ «ЗВЯЗДЫ» патрэбны машыністкі на дзённую і вячэрнюю работу. Звяртацца па тэл № 20-830, ці непасрэдна ў сакратарыят (трэці паверх).

МЕНСКІ 2-ГАДОВЫ НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ НАЦМЕНШАСЦЕЙ, які рыхтуе настаўнікаў для рускіх, яўрэйскіх і польскіх школ,

АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ на першы курс

рускага, яўрэйскага і польскага аддзяленняў наступных факультэтаў:

РУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ: 1. ГІСТОРЫІ. 2. МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ. 3. ФІЗІКІ І МАТЭМАТЫКІ. 4. ПРЫРОДАЗНАЎСТВА І ГЕАГРАФІІ.

ЯЎРЭЙСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ: 1. ГІСТОРЫІ. 2. МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ. 3. ФІЗІКІ І МАТЭМАТЫКІ. 4. ПРЫРОДАЗНАЎСТВА І ГЕАГРАФІІ.

ПОЛЬСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ: 1. МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ. 2. ГІСТОРЫІ.

Прыём заяў да 1 жніўня 1937 года.

Прыёмныя іспыты праводзяцца з 1 па 20 жніўня. Паступаючыя падвяргаюцца іспытам па наступным прадметах: а) рускай мове (пісьмовы твор, граматыка і літаратура), на польскае і яўрэйскае аддзяленні таксама і па роднай мове; б) палітграмаце; в) матэматыцы; г) фізіцы; д) хіміі; е) па адной з замежных моў — англійскай, нямецкай ці французскай — па выбару паступаючага.

Паступаючыя павінны прадставіць наступныя дакументы: Атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы (дзесяцігодка, тэхнікум, рабфак), аўтабіяграфію, даведку аб здароўі, тры фотакарткі (завераныя), пашпарт (прад'яўляецца асабіста), даведку аб адносінах да вайсковай павінасці (для ваеннаабавязаных).

Большасць прынятых забяспечваецца стыпендыяй. Для прыезджых прадастаўляецца інтэрнат.

Адрас інстытута: г. Менск, вул. Валадарскага, 5.

ДЫРЭКЦЫЯ.

МАГІЛЕЎСКАЯ ФЕЛЬЧАРСКА-АКУШЭРСКАЯ І ФАРМАЦЭЎТЫЧНАЯ ШКОЛЫ (былы медполітэхнікум),

якія рыхтуюць фельчароў, акушэрак і памочнікаў правізараў,

АБВЯШЧАЮЦЬ АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ

на 1937—38 навучальны год на наступныя аддзяленні:

1. Акушэрскае з 2-гадовым курсам навучання — 270 асоб.
2. Фельчарскае з 3-гадовым курсам навучання — 330 асоб.
3. Фармацэўтычная школа з 3-гадовым курсам навучання — 120 асоб.

Прыём заяў праводзіцца з 20 чэрвеня па 1 жніўня.

Да заяў трэба прыкласці наступныя дакументы (абавязкова ў арыгіналах): 1) пасведчанне аб нараджэнні, 2) пасведчанне аб сканчэнні нямоўнай сярэдняй школы, 3) пасведчанне дзяржаўнай лячэбнай установы аб тым, што паступаючы не мае хвароб, перашкаджаючых для паступлення ў фельчарска-акушэрскую і фармацэўтычную школы, 4) дзве фотакарткі, 5) уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, 5) аўтабіяграфію, засведчаную совецкімі або прафсаюзнымі арганізацыямі, 6) паштовых марак на 80 кап.

Заявы прымаюцца ад асоб ва ўзросце ад 15 да 35 гадоў.

На іспыты кожны, падаўшы заяву будзе выклікан абвесткай і без паведамлення на іспыты не павінен з'яўляцца.

Іспыты адбудуцца з 1 да 20 жніўня па матэматыцы, фізіцы, граматазнаўству, геаграфіі, беларускай і рускай мовах і літаратуры за курс нямоўнай сярэдняй школы.

Заняткі пачнуцца з 1 верасня 1937 г. Усе залічаныя ў фельчарска-акушэрскую і фармацэўтычную школы, якія маюць 16 год. абавязковых пашыўных з'явіцца на заняткі з пашпартам.

Усе прынятыя інвалідныя забяспечваюцца інтэрнатам, сталовай і пральняй.

Стыпендыяй вучні забяспечваюцца па паспяховасці ў размерах ад 60 да 80 рублёў.

Заявы накіроўваць на адрасу: гор. Магілеў, БССР, вуліца Карла Маркса № 142.

ДЫРЭКЦЫЯ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 6

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ

20 мая 1937 г. г. Менск.

АБ ПРОДАЖЫ МАЛАКА І МАЛОЧНЫХ ПРАДУКТАЎ

У мэтах забеспячэння насельніцтва г. Менска добраякасным малаком і малочнымі прадуктамі, Менскі гарадскі совет пастанаўляе:

1. Продаж малака і малочных прадуктаў дазваляецца на спецыяльна вызначаных месцах: з вазоў і са сталоў не ніжэй 3/4 метра ад узроўню зямлі.

2. Забараняецца:

а) выбіраць для продажу малака і малочных прадуктаў месца ў адлегласці бліжэй 50 метраў ад выграбных і смяццёвых ям, прыбіраленьі іншых крыніц забруджання;

б) трымаць каля месц продажу малака і малочных прадуктаў тавары з розным непрыемным пахам (газы, дзёгцю, рыззя, скур і інш.).

3. Прадаўцы малака абавязаны насіць чыстую спецвопратку (халаты або пярэднікі з нагруднікам і нарукаўнікамі, касынку) і ўтрымліваць у чыстаце рукі.

Продаж малака ад хворай жывёлы забараняецца.

4. Абавязаць Менскую дзяржаўную санітарную інспекцыю вытвараць лабараторны выбарачны кантроль прадаваемага на рынках малака.

Малако, прызнанае нядобраякасным, падлягае ізаляцыі.

5. Пасуда, з якой прадаецца малако і малочныя прадукты, павінна быць чыстай і зроблена не з шкоднага для здароўя матэрыялу (лужаныя бідоны, шкляная пасуда). Пакрыўкі павінны быць шчыльныя. Ужыванне пробкі з анучы, паперы і т. д. забараняецца.

6. Віноўныя ў парушэнні гэтай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу ў суме да 100 руб. або к прымусовым работам да 14 дзён.

7. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на міліцыю і санітарную інспекцыю.

Старшыня Менскага гарадскога совета Е. ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менскага гарадскога совета І. КАЗЛОЎСКІ.

ДА ВЕДАМА КІРАЎНІКОЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, УСТАНОЎ, СОЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ.

ІНСПЕКЦЫЯ ПРАЦЫ ЦСПСБ

даводзіць да ведама ўсіх прадпрыемстваў, устаноў, соўгасаў і калгасаў, што згодна пастановы СНК СССР ад 22 красавіка 1937 г. і СНК БССР ад 28 мая 1937 г. НАГЛЯД ЗА ПАРАВЫМІ КАТЛАМІ, САСУДАМІ ПАД ЦІСКАМ, БАЛОНАМІ І ПАД'ЕМНЫМІ ПАБУДОВАМІ в 1 чэрвеня 1937 г. ускладзен на народныя камісарыяты, у веданні якіх знаходзяцца гэтыя агрэгаты.

У сувязі з гэтым па ўсіх пытаннях агляду і выпрабавання катлоў, апаратаў пад ціскам і пад'ёмнікаў у далейшым належыць звяртацца ў інспекцыю котлянадзора адпаведнага наркамата (у залежнасці ад гаспадарчай падначаленасці прадпрыемства, установы або гаспадаркі).

ІНСПЕКЦЫЯ ПРАЦЫ ЦСПСБ.

Уп. Галоўлітбела № К—2118. Друкарня газеты «Звязды». Менск, Совецкая, 63. К., К., С.